ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 53 (2219)
5 ліпеня 1968 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

НАШ ПАЧЭСНЫ ПАСАД МІЖ НАРОДАМІ

На пытанні карэспандэнта «Літаратуры і мастацтва» адказвае старшыня прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі В. С. СМІРНОЎ

У пачатку 20-х гадоў народны паэт Беларусі Янка Купала пісаў:

Было яно калісьці,
Калі, як жаўталісце.
Жылі мы — не жылі:
Ішлі дні без карысці,
І сорам было выйсці
У свет з сваёй зямлі.

Сапраўды, быў час, калі мала хто ў свеце ведаў, што такое Беларусь і беларусы. А калі хто і ведаў, дык толькі тое, што загубілася яна, Беларусь недзе сярод лясоў і балот, што гэта бедны, «забыты богам» край, населены гаротнымі і цёмнымі людзьмі, якія наўрад ці маюць што-небудзь, з чым можна было б выйсці ў шырокі свет, падзяліцца з іншымі народамі. На працягу стагоддзяў слала Беларусь у свет, як сведкі сваёй беднасці, адсталасці і падняволенасці, толькі лён ды пяньку, смалу ды дзёгаць. На працягу стагоддзяў беларускі народ быў пазбаўлены не толькі волі, але і права мець сваю мову, сваю песню...

Наша гутарка са старшынёй прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі В. Смірновым пра тое, як будзе адзначацца 50-годдзе БССР за мяжой, што робіць для гэтага таварыства, пачалася менавіта з гэтых гаркотна-самотных купалаўскіх радкоў. Нагадаўшы іх, Віталь Сцяпанавіч усміхнуўся:

— Так, «было яно калісьці»... І было не так даўно, як здаецца цяпер нам, не вельмі маладым, але не надта і старым людзям. Куды бліжэй нам іншыя купалаўскія радкі, па-мойму, з той жа паэмы «Безназоўнае», от гэтыя:

Беларусь на куце
У хаце сваёй села.—
Чарка мёду ў руцэ,
Пазірае смела.
А суседзі глядзяць,
Дзівяцца суседзі:
— То ж яна з мужыкоў,
А як выйшла ў людзі!
Як мне больш гадкоў,
Што ж тады ўжо будзе?!

Сёння Беларусь, у сваім юбілейным годзе, адна з квітнеючых савецкіх рэспублік. Дастаткова, думаю, нагадаць толькі некаторыя лічбы. БССР займае сёння ў краіне першае месца па вытворчасці вялікагрузных аўтамашын і сіласаўборачных камбайнаў, другое — па выпуску аўтаматычных ліній, матацыклаў, шарыкападшыпнікаў, фанеры, ільняных тканін, трэцяе — па вытворчасці металарэжучых станкоў, трактараў, веласіпедаў, тэлевізараў, халадзільнікаў, скуранога абутку. Менавіта гэтым, а не пянькой і дзегцем, славіцца сёння Беларусь у нашай краіне і за мяжой. У дзесятках краін свету працуюць сёння нашы магутныя самазвалы і універсальныя трактары, тысячы людзей носяць на руках беларускія гадзіннікі і апранаюцца ў беларускія тканіны. Ведаюць за мяжой беларускія песні і танцы, ведаюць работы нашых вучоных, творы нашых кампазітараў, пісьменнікаў, мастакоў.

Савецкая Беларусь выйшла на міжнародную арэну і па лініі дзяржаўных адносін. Наша рэспубліка з'яўляецца адным з членаў-заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, членам многіх спецыялізаваных міжнародных арганізацый, такіх, як ЮНЕСКО, Міжнародная арганізацыя працы, Міжнароднае агенцтва па атамнай энергіі і інш. У сваёй знешняй палітыцы Беларуская Савецкая Рэспубліка абараняе прынцыпы міру і дэмакратыі, супрацоўніцтва і дружбы паміж народамі. Такая палітыка прыносіць добры плён, выклікае пачуцці павагі да нашай рэспублікі і да нашага народа з боку іншых народаў свету.

Дружба—цудоўнае слова. Асабліва значэнне набывае яно ў дачыненні да адносін паміж народамі. Ад дружбы і супрацоўніцтва народаў свету залежыць будучыня чалавецтва. Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі—масавая добраахвотная арганізацыя — бачыць сваю задачу ў разгортванні разнастайных, і ў першую чаргу культурных, сувязей паміж нашым народам і народамі свету.

— З якімі краінамі і арганізацыямі падтрымлівае сувязь Беларускае таварыства?

— Вельмі і вельмі з многімі. Адзін толькі пералік краін і арганізацый, з якімі мы маем больш-менш сталую сувязь, заняў бы добры десятак старонак. Таму лепш зноў звярнуцца да лічбаў. Сёння мы падтрымліваем сувязі з 271 грамадскай і культурнай арганізацыяй за рубяжом, а таксама з многімі асобнымі людзьмі ў 54 краінах.

— Якія, Віталь Сцяпанавіч, формы гэтых сувязей?

— Самыя разнастайныя. Напрыклад: узаемны абмен даведачнымі і інфармацыйнымі матэрыяламі, літаратурай, фотавыстаўкамі, кінафільмамі, абмен дэлегацыямі вучоных, работнікаў культуры і мастацтва, спецыялістаў розных галін народнай гаспадаркі, правядзенне дзён і тыдняў літаратуры, культуры і мастацтва, кінафестываляў і г. д.

Сярод тых, з кім мы падтрымліваем сувязь, ёсць, натуральна, людзі розных светапогляду, перакананняў, інтарэсаў, і таму адносіны з імі складваюцца ў нас па-рознаму, але мы заўсёды імкнёмся да таго, каб адносіны гэтыя будаваліся на аснове ўзаемаразумення і супрацоўніцтва.

Асабліва цесная дружба працоўных нашай рэспублікі з працоўнымі братніх сацыялістычных краін. Тут дружба прымае канкрэтныя формы, пераходзіць ва ўзаемныя сяброўскія кантакты. Напрыклад, меліяратары Брэстчыны даўно і шчыра сябруюць з меліяратарамі Люблінскага ваяводства Польскай Народнай Рэспублікі. Рабочых Мінскага трактарнага завода сяброўскія сувязі звязваюць з рабочымі Карлаўскага трактарнага завода ў Балгарыі. Мінчане памагалі балгарскім сябрам будаваць першынец балгарскага трактарабудаўніцтва, асвойваць выпуск прадукцыі, удасканальваць трактар «Балкан». Дружба, якая народзілася некалькі гадоў назад, штогод развіваецца і ўзмацняецца. На Мінскім трактарным па ініцыятыве праўлення таварыства савецка-балгарскай дружбы абсталяваны салон дружбы з Балгарыяй. Тут наладжваец-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ПАЗЫЎНЫЯ БУДУЧАГА ТЭЛЕЦЭНТРА



Павольна плыве ажурная стрэла вежавага крана, несучы штабель цэглы. Там-сям ляжаць жоўтыя капцы пяску, пад'язджаюць і ад'язджаюць машыны. Немітуслива, спакойна працуюць людзі... Звычайны малюнак будоўлі.

Пад Мінскам, у раёне Калодзішчаў, пачалося будаўніцтва перадаючай станцыі новага рэспубліканскага тэлецэнтра. Пакуль што тут працуюць бетоншчыкі — брыгада Івана Карнейчыка з будаўнічага ўпраўлення № 25 пятага трэста Міністэрства прамысловага будаўніцтва. Яны падрыхтавалі ўжо некалькі катлаванаў, уклалі сотні кубаметраў бетону і вывелі цокальныя паверхі дапаможных памяшканняў. Спяшаюцца бетоншчыкі, імкнуцца хутчэй перадаць будоўлю мантажнікам.

А вось апаратна-студыйнага комплексу новага тэлецэнтра будаваць яшчэ не пачалі. Ён пакуль што ў праекце, у папцы кіраўніка радыёўпраўлення Міністэрства сувязі рэспублікі Леанарда Уладзіміравіча Касцюшкі. З ім я сустрэўся, каб распытаць пра будучы тэлецэнтр.

Размову пачалі каля карты з рознакаляровымі кружкамі. Дзевяццю жоўтымі на ёй адзначана цяперашняя тэлесетка, зялёнымі— будучая. Жоўтыя кружкі не ахопліваюць усёй тэрыторыі рэспублікі. Палессе і аддаленыя раёны некаторых абласцей яшчэ не маюць тэлебачання.

— Каб расшырыць зону дзеяння, — гаворыць Леанард Уладзіміравіч, — даць усім гледачам рэспублікі шматпраграмнае і каляровае тэлевізійнае вяшчанне, трэба пабудаваць новы цэнтр.

Чатырохграневая прыгажуня — апорная мачта ўзнімецца на 350 метраў. Яна павялічыць радыус прыёму ў два з палавінай разы. Перадачы Мінскага тэлецэнтра змогуць глядзець такія гарады, як Валожын, Старыя Дарогі, Смаргонь. І, вядома, палепшыцца тэхнічная якасць перадач. Будучая станцыя расшырыць абмен тэлевізійнымі праграмамі з многімі гарадамі краіны.

«Дапамагаць» новай перадаючай станцыі будуць пяць рэтранслятараў, якія дашлюць яе сігналы ва ўсе куткі рэспублікі. Чатыры з іх пабудаваны ўжо, а на пятым, які ўзводзіцца ў Петрыкаве, неўзабаве пачнецца мантаж абсталявання. Дзякуючы гэтаму, праграму Мінскага тэлецэнтра зможа глядзець усё Палессе. Дарэчы, вышыня мачты кожнага рэтранслятара таксама 350 метраў.

Паказваючы розныя чарцяжы, схемы антэнных апор, Леанард Уладзіміравіч удакладняў:

— Мы піянеры ў прымяненні такіх вышынных антэн. Гэта скараціла іх колькасць, ды і будаўніцтва абыходзіцца танней.

Спрыяльныя ўмовы будуць створаны для тэлежурналістаў і тэхнічных работнікаў тэлецэнтра ў новым апаратна-студыйным комплексе. Будаўніцтва яго пачнецца крыху пазней па вуліцы Волгаградскай.

Комплекс будынкаў у чатыры, шэсць і трынаццаць паверхаў зойме плошчу ў пяць гектараў. Аб'ём яго ў пятнаццаць разоў большы таго, што займаюць памяшканні цяперашняга студыйнага корпуса. Студыі светлыя, прасторныя —па шэсцьсот і тысячы квадратных метраў. Адсюль адначасова будзе весціся чатырохпраграмнае вяшчанне. У комплексе будынкаў размесціцца асобны цэнтр каляровых перадач, а побач з ім — карпусы дэкарацыйных майстэрань і шмат дапаможных памяшканняў. Тэхнічнае абсталяванне будзе такім, якое мае зараз Маскоўскі тэлецэнтр у Астанкіне. На новым тэлецэнтры шырока будзе прымяняцца відэё-магнітны запіс.

Пад канец размовы я спытаўся пра лёс цяперашняга студыйнага корпуса.

— Тут размесціцца студыя тэлефільмаў, — адказаў Леанард Уладзіміравіч.

Да новых пазыўных будучага тэлецэнтра!

Р. КАДЗЕТ.

На здымках—лепшыя будаўнікі перадаючай станцыі брыгадзір бетоншчыкаў Іван Карнейчык (справа) і бетоншчык Уладзімір Лапёнак і макет апаратна-студыйнага комплексу тэлецэнтра.

УСЕСАЮЗНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ САВЕТ

Тры дні праходзіў у Маскве Усесаюзны з'езд настаўнікаў. З усіх кутоў краіны на свой вялікі педагагічны савет сабралося каля чатырох тысяч прадстаўнікоў 2,5-мільённай арміі работнікаў народнай асветы.

Да дэлегатаў з'езда і ў іх асобе да ўсіх тых, хто вучыць і выхоўвае нашых дзяцей каго аб'ядноўвае адна з самых цудоўных і высакародных прафесій на зямлі, звярнуліся з прывітаннем Цэнтральны Камітэт КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў СССР. У прывітанні адзначаецца, што савецкае настаўніцтва, з'яўляючыся самай шматлікай часткай нашай слаўнай інтэлігенцыі, аддае ўсе сілы і веды справе асветы шырокіх народных мас, уносіць вялікі ўклад у памножанне духоўных і матэрыяльных багаццяў сацыялістычнага грамадства.

Дэлегаты з'езда заслухалі і абмеркавалі даклад міністра асветы СССР М. А. Пракоф'ева.

Перад удзельнікамі з'езда з вялікай прамовай выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў.

60 ДЗЁН СВЯТА

ЗАКОНЧЫЎСЯ РЭСПУБЛІКАНСКІ ФЕСТЫВАЛЬ ПРАФЕСІЯНАЛЬНАГА МАСТАЦТВА

Два месяцы дзень у дзень у гарадах і сёлах, што стаяць на бурлівай Дзвіне, на ціхім Сожы, на велічным Нёмане, на сотнях блакітных азёр гучалі музыка і песні. А песні тыя ішлі ад сэрца, і спявалася ў іх аб нашай цудоўнай краіне, аб яе людзях, аб шчасці, якое выпала на долю колісь забітага і прыніжанага беларускага мужыка—быць гаспадаром і грамадзянінам вялікай Краіны Саветаў.

Прафесіянальнае мастацтва Беларусі, народжанае Кастрычнікам, напярэдадні 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі з гонарам вытрымала свой нялёгкі экзамен. Музыкантам, танцорам, спевакам, чытальнікам апладзіравала ўся рэспубліка.

Учора Рэспубліканскі фестываль прафесіянальнага мастацтва закончыўся. Урачыстае закрыццё адбылося ў Мінскім акруговым Доме афіцэраў. Сюды сабраліся працоўныя сталіцы, госці— удзельнікі Усесаюзнай нарады па сельскім будаўніцтве, што цяпер праходзіць у Мінску.

У вялікім канцэрце прынялі ўдзел вядучыя беларускія калектывы—акадэмічная харавая капэла, сімфанічны аркестр Беларускай дзяржаўнай філармоніі, Беларускі дзяржаўны народны хор, ансамбль танца БССР, эстрадныя спевакі і чытальнікі.

БІБЛІЯТЭКАРЫ РАЯЦЦА

У гарадскім пасёлку Краснаполле сабраліся бібліятэкары з Крычаўскага, Чэрыкаўскага, Слаўгарадскага раёнаў і з сельскіх бібліятэк самога Краснапольскага раёна. Тут тры дні праходзіў семінар па краязнаўчай рабоце.

Асабліва цікавай была сустрэча бібліятэкараў чатырох раёнаў ля Кургана Бессмяротнасці. Сакратар райкома партыі В. Марозава гаварыла аб выхаванні моладзі на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях нашага народа. З цікавымі ўспамінамі выступілі былы сакратар камітэта камсамола партызанскага атрада, які дзейнічаў на Краснапольшчыне, П. Тарасенка, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Л. Андрэенка і іншыя. Рэжысёр Краснапольскага народнага тэатра Л. Багам'я прачытаў «Рэквіем» Р. Раждзественскага. Літаратурны супрацоўнік раённай газеты «Чырвоны сцяг» Н. Шалаева прачытала свой верш «Курган Бессмяротнасці».

Аб тым, што зроблена па краязнаўчай рабоце, аб планах на будучае расказала загадчыца Краснапольскай раённай бібліятэкі Ю. Карчак. Вопытам работы падзяліліся многія бібліятэкары з суседніх раёнаў.

Гэта цікавы семінар быў скліканы па ініцыятыве работнікаў Магілёўскай абласной бібліятэкі.

С. СЯМЁНАЎ.

ДОБРЫ ДЗЕНЬ, РОДНАЯ ЗЯМЛЯ!

Шчыра сустракала Магілёўшчына сваіх землякоў пісьменнікаў —масквіча М. Коласава, ленінградца П. Кабзарэўскага, мінчан С. Грахоўскага, П. Кавалёва, Э. Валасевіча, П. Прыходзьку, В. Бурносава, М. Гарулёва.

Тыдзень працягвалася гэтая творчая сустрэча. У Доме палітычнай асветы ў Магілёве адбыўся вялікі вечар, на якім Павел Кавалёў расказаў слухачам аб здабытках беларускай літаратуры, аб поспехах, якім яна карыстаецца не толькі ў нашай краіне, але і за межамі яе.

Цікавым і хвалюючым было выступленне Марка Коласава, сябра Мікалая Астроўскага, першага рэдактара рамана «Як гартавалася сталь». Ён падзяліўся сваімі ўражаннямі аб Магілёве, у якім не быў больш за 40 гадоў.

На вечары выступіў таксама перакладчык беларускай літаратуры Павел Кабзарэўскі.

Свае вершы прачыталі Сяргей Грахоўскі і Пятро Прыходзька, а таксама паэты, якія і сёння жывуць у Магілёве, — Аляксей Пысін і Васіль Матэвушаў.

Літаратурныя вечары прайшлі ў Бабруйску, Кіраўску, Крычаве, Клімавічах. Пісьменнікі пабывалі ў піянерскіх лагерах, выступілі ў калгасах, саўгасах, сустраліся з рабочымі буйнейшых прадпрыемстваў. Усюды яны былі жаданымі і дарагімі гасцямі.

У гэтыя дні газета «Магілёўская праўда» прадставіла землякам-пісьменнікам свае старонкі. Чытачы пазнаёміліся з урыўкамі з новай аповесці П. Кавалёва «Чырвоны лядок», з вершамі П. Прыходзькі і Э. Валасевіча, з перакладамі П. Кабзарэўскага.

Прыезд паэтаў, празаікаў, перакладчыкаў, крытыкаў да сваіх землякоў ператварыўся ў творчую справаздачу напярэдадні 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі.

СУСТРЭЧА ПІСЬМЕННІКАЎ З НАСТАЎНІКАМІ МІНШЧЫНЫ

Сустрэча пісьменнікаў з настаўнікамі ў пісьменніцкім клубе за апошнія гады сталі традыцыйнымі. Дзве такія сустрэчы адбыліся сёлета. Не так даўно ў гасцях у пісьменнікаў пабывала група настаўнікаў Магілёўшчыны, а 3 ліпеня ў клубе Саюза пісьменнікаў сабраліся выкладчыкі роднай мовы і літаратуры школ Міншчыны. Адбылася цікавая і ўзаемна карысная гаворка аб сённяшнім стане беларускай літаратуры, аб яе выкладанні ў школе, аб умацаванні сувязей пісьменнікаў са школай.

Настаўнікаў вітаў сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Іван Шамякін. Ён гаварыў пра тое, як рыхтуюцца беларускія літаратары да 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі, пра лепшыя здабыткі нашай літаратуры за пяцьдзесят савецкіх гадоў, пра неабходнасць больш шырокай прапаганды беларускага мастацкага слова.

Галоўны рэдактар «Полымя» Павел Кавалёў, галоўны рэдактар «Нёмана» Андрэй Макаёнак, адказны сакратар «Маладосці» Уладзімір Юрэвіч, галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» Нічыпар Пашкевіч пазнаёмілі настаўнікаў з планамі работы рэдакцый.

Думкамі аб ролі настаўнікаў у прапагандзе літаратуры, сваімі творчымі планамі падзяліліся Васіль Вітка, Аляксей Кулакоўскі, Іван Мележ, Алесь Пальчэўскі, Алесь Савіцкі, Тарас Хадкевіч. Паэты Мікола Аўрамчык, Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Язэп Семяжон, Браніслаў Спрынчан, Міхась Скрыпка, Станіслаў Шушкевіч прачыталі свае вершы.

У размове прынялі ўдзел настаўнікі Я. Касцюк, Я. Кастэцкая, В. Протчанка.

ВОДНЫМІ ДАРОГАМІ

Агітбрыгада народнага ансамбля песні і танца «Дняпро» Рэчыцкага гарадскога Дома культуры на цеплаходзе «Уладзімір Маяноўскі» прайшла водным маршрутам па Дняпры, Сожы і Прыпяці. 13 удзельнікаў агітбрыгады на чале з мастацкім кіраўніком, заслужаным дзеячам культуры БССР Васілём Мікалаевічам Сакаловым наведалі прыбярэжныя населеныя пункты, пабывалі ў рачнікоў, якія працуюць на самаходных баржах. Свой агітпаход аматары самадзейнай сцэны прысвяцілі 50-годдзю БССР, Кампартыі Беларусі і ВЛКСМ.

Прадстаўнікі вядомага ў рэспубліцы ансамбля, які налічвае 120 чалавек, наведалі Лоеў, Нароўлю і іншыя гарады і сёлы. Пабывалі яны і ва ўкраінскіх сяброў. І ўсюды іх сустракалі як дарагіх гасцей.

На здымку—вакальны квінтэт у складзе Зінаіды Мельнікавай, Алены Гапцар, Зінаіды Саланец, Наталлі Бароўскай і Надзеі Козел у час выступлення на турбазе «Сож». Балністы — Аляксей Вішняк і Аляксандр Ключнікаў.

Фота В. ЧАЧАНКОВА.

ПОМНІКІ КУЛЬТУРЫ—УСЕНАРОДНЫ СКАРБ

Як паведамлялася ўжо ў нашай газеце 23 красавіка г. г., у мэтах актывізацыі вывучэння і прапаганды помнікаў культуры Міністэрства культуры СССР і Акадэмія навук СССР прапанавалі стварыць поўны Звод помнікаў культуры народаў СССР.

Гэтымі днямі ў Маскве, у Інстытуце гісторыі мастацтваў (цэнтр па падрыхтоўцы Зводу) была склікана ўсесаюзная канферэнцыя, на якой абмяркоўваліся пытанні, што датычаць навуковай накіраванасці і формы арганізацыі гэтай вялікай працы.

Першы Звод помнікаў культуры народаў СССР будзе стварацца адначасова ў навуковых цэнтрах усіх савецкіх рэспублік.

Калегія Міністэрства культуры БССР і Прэзідыум Акадэміі навук БССР вырашылі для кіраўніцтва падрыхтоўкай і выданнем Зводу помнікаў культуры народаў СССР арганізаваць рэдакцыйна-выдавецкі савет на чале з дырэктарам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР П. Глебкам.

НАВЕДВАЛЬНІК—МАЛЫ, КЛОПАТЫ—ВЯЛІКІЯ

УСЕСАЮЗНЫ СЕМІНАР ЗАГАДЧЫКАЎ ДЗІЦЯЧЫХ СЕКТАРАЎ І ГАРАДСКОЎ ПАРКАЎ КУЛЬТУРЫ І АДПАЧЫНКУ

У САМЫМ цэнтры горада Мінска, ля Свісла́чы, ёсць цудоўны куток прыроды — Цэнтральны дзіцячы парк культуры і адпачынку імя Максіма Горкага. Летась як пераможцу Усесаюзнага конкурсу паркаў, прысвечанага 50-годдзю Вялікага Кастрычніка, яму прысвоена званне «Парк выдатнай работы». Можа таму парк імя М. Горкага стаў на чатыры дні месцам усесаюзнага семінара загадчыкаў дзіцячых сектараў і гарадскоў паркаў культуры і адпачынку.

І, праўда, гасцям было што паглядзець і паслухаць. Наш дзіцячы парк за апошнія гады нібы памаладзеў. Многа тут пасаджана дрэў, заасфальтавана дарожак. На высокім узгорку ўзняў свае купалы планетарый. Вельмі арганічна ўпісалася ў пейзаж, нібы век стаяла пад гэтым схілам, кафэ — прыгожае, сучасных форм збудаванне. Уступіў у строй спартыўны павільён—выдатны падарунак школьнікам. Абноўлены многія атракцыёны. Нават стары пасажырскі самалёт, падараваны дзецям лётчыкамі, ператварыўся ў кінатэатр-малютку «Пяты акіян». Абслугоўваюць яго дзяўчынкі-«сцюардэсы». Паблізу для малышоў зроблены фантан-«лягушатнік». Ёсць свой гарадок з вуліцамі і тратуарамі для пешаходаў, светафорамі, дарожнымі знакамі.

Галоўны архітэктар праекта рэканструкцыі парку Л. Усава расказала гасцям Мінска, якія цудоўныя змены адбудуцца тут у бліжэйшыя гады.

Знаёміліся ўдзельнікі семінара з мінулым, сучасным і будучым Мінска. Глядзелі спецыяльныя дакументальныя стужкі, рабілі экскурсіі па горадзе, наведвалі музеі. Перад імі з цікавым расказам выступаў галоўны архітэктар сталіцы В. Чарнышоў. Праслухалі госці вусны часопіс «Навіны беларускага мастацтва і літаратуры», пабывалі на канцэртах прафесіянальных калектываў у парку, на раніцы «Не дарма мы носім імя Леніна», на тэатралізаваным свяце «Ляці ад бацькоў да сыноў спраў гераічных эстафета», прысвечаным Дню савецкай моладзі.

І ўсё ж галоўнае на семінары — гэта абмен вопытам работы з дзецьмі, шчырая і цікавая размова аб тым, як дастойна сустрэць 50-годдзе Ленінскага камсамола і 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна, унесці як мага больш ўклад у выхаванне маладога пакалення.

Начальнік Упраўлення культуры Мінскага гарвыканкома М. Жукоўскі, сакратар гаркома камсамола В. Раломскі, мастацкі кіраўнік парку імя Горкага Л. Перліна расказалі ўдзельнікам семінара, як пастаўлена выхаваўчая работа з дзецьмі ў мінскіх парках.

Летась і сёлета дзесяткі тысяч маладых мінчан прынялі ўдзел у паходах па месцах баявой славы. У арганізацыі гэтых паходаў прымалі ўдзел і нашы парні. Дзеці аднаўлялі партызанскія зямлянкі, расшуквалі ўдзельнікаў абароны Мінска ў сорак першым годзе. Атрад «Юных следапытаў», створаны паркам імя Чалюскінцаў і бібліятэкай «Юнацтва», вярнуў народнай памяці імёны 23 загінуўшых абаронцаў Мінска, рэстаўрыраваў камандны пункт 100-й дывізіі. На сродкі, зароблены на нядзельніках і атрыманыя за металалом, пабудаваны помнік Герою Савецкага Саюза Барысу Акрэсіну, які паўтарыў пад Мінскам подзвіг Мікалая Гастэлы.

Атрад «Чырвоных следапытаў» парку імя Горкага сабраў шмат матэрыялаў аб пахаваных тут героях грамадзянскай вайны Даўмане і Флаксе і воіне Савецкай Арміі Іванкове, які загінуў у Айчынную вайну. Вучні зрабілі некалькі экскурсій па месцах камуністычнага і камсамольскага падполля Мінскага раёна.

Тэма прапаганды гераічных спраў народа займае ў рабоце парку імя Горкага першае месца. Найбольшае ўражанне робяць на дзяцей сустрэчы з удзельнікамі знамянальных падзей. Толькі за леташні год «Клуб цікавых сустрэч», створаны ў парку, арганізаваў 60 вечароў-сустрэч з ветэранамі рэвалюцыі і войнаў, Героямі Сацыялістычнай Працы, знатнымі мінчанамі.

Кожны год 9-га мая і 3-га ліпеня парк імя Горкага праводзіць дні памяці герояў. Дзеці разам з ветэранамі войнаў ідуць да абеліска Перамогі, да помніка Марату Казею, дзе ўскладваюць кветкі і вянкі, слухаюць расказы пра бессмяротны подзвіг народа. Тут жа школьнікаў урачыста прымаюць у піянеры.

Праводзяцца ў парку тэатралізаваныя прадстаўленні, прысвечаныя рэвалюцыйным святам. Часам свята пераносіцца ў мікрараёны, на вуліцы горада, у падшэфны калгас ці школу-інтэрнат. На «Свяце вуліцы А. Кашавога» ўдзельнікам было зачытана пісьмо-прывітанне ад маці героя-камсамольца. На «Свяце вуліцы С. Грышаўцэ» прысутнічалі сваякі праслаўленага лётчыка і яго сябра іспанец Антоніо Арпос. Сааўтарамі гэтых «свят вуліц» былі Палацы культуры Мінскага трактарнага завода і камбінатаў.

У работнікаў парку імя Горкага шмат добраахвотных памочнікаў-бібліятэкараў, настаўнікаў, камсамольцаў. Працуе і дзіцячы савет парку. Добра памагаюць члены раённых і гарадскога аддзяленняў таварыства «Веды». Іх сілами праводзіцца лекторый «Свет за тыдзень». Другі лекторый — «У свеце прыгожага» вядуць работнікі мастацкага музея, трэці — «Здароўе» — работнікі Дома санітарнай асветы. Дзіцячая бібліятэка № 1 рэгулярна праводзіць агляды «Па старонках піянерскіх часопісаў». Цыкл лекцый «У нагу з партыяй крочыць вечна юны камсамол» чытаюць супрацоўнікі Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэкі імя Астроўскага.

Разам з Домам піянераў парк праводзіў свята гарадскіх піянерскіх лагераў (а іх у Мінску 70!), а потым — тыдзень лагераў пад дэвізам «Цвіці і красуйся, родная Беларусь».

Ужо некалькі гадоў кожную вясну праходзяць у парку агляды юных талентаў дзіцячых садоў, святы песні ў гонар дня нараджэння піянеры. У «Школьнай музычнай вясне» штогод прымаюць удзел лепшыя дзіцячыя калектывы мастацкай самадзейнасці Мінска. Пераможцаў гэтых спаборніцтваў парк за свой кошт возіць на экскурсію ў Брэсцкую крэпасць. Дзесяткі разоў выступаў перад юнымі гледачамі дзіцячы самадзейны лялечны тэатр, які таксама створаны ў парку імя Горкага.

Шмат цікавага можна было пачэрпнуць і з выступленняў гасцей.

У кіеўскіх парках практыкуюцца вучнёўскія універсітэты культуры. У Ленінградзе вялікая ўвага надаецца фігурнаму катанню. Юныя фігурысткі ездзілі выступаць нават у Маскву. У Ізмайлаўскім парку Масквы дзеці вырасцілі на пустым парк саджанцаў дэкаратыўных дрэў. Гэты парк будзе пасаджаны ў дзень стагоддзя з дня нараджэння Леніна. У Арджанікідзе традыцыйнай сталі карнавалы любімых літаратурных герояў, у Камунарску — спаборніцтвы юных мастакоў - манументалістаў (малююць дзеці каляровымі крэйдамі проста на асфальце паркавых дарожак). У Ташкенце прызвічаўся звычай кожную восень чаладжваць буйныя выстаўкі даро прышкольных участкаў. У Пяцігорску ў дзіцячым парку працуюць юныя сябры міліцыі, пажарнікаў, авіятараў. У Баку клуб калекцыянераў пры парку вырас да паўтары тысяч чалавек. У многіх месцах наладжваюцца конкурсы «Наш горад вачыма дзяцей», фестывалі дзіцячай цацкі-самаробкі і г. д.

Па агульным прызнанні семінар прайшоў цікава і прынёс шмат карысці.

Са студзеня 1969 года пачнецца агляд-конкурс паркаў, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. І думаецца, што гэты семінар зробіць добры ўплыў на падрыхтоўку да агляду.

П. МІСЬКО.

НА ГАСТРОЛЬНЫХ МАРШРУТАХ

Сцэна са спектакля «Пад чорнай маскай» Палтаўскага музычна-драматычнага тэатра. Саня — артыстка Ж. Кастрова, Давыдаў — заслужаны артыст УССР В. Канапацкі, Жарэфіна — заслужаная артыстка УССР Т. Кісялёва.

Фота Ул. КРУКА.

ГОСЦІ З ПАЛТАВЫ

Маляўнічае відовішча, цудоўныя галасы, віхура танца — вось што запамінаеш, калі глядзіш украінскую музычную драму.

Мінчане цёпла сустрэлі калектыў Палтаўскага музычна-драматычнага тэатра імя М. В. Гогаля. Гастролі яго выклікалі вялікую цікавасць мінскіх аматараў тэатра.

Палтава мае адзін з самых цікавых тэатральных калектываў на Украіне. Да таго ж, гэты тэатр — адзін са старэйшых у рэспубліцы. Яго гісторыя пачынаецца з тэаго дня 1819 года, калі ў Палтаве ўпершыню была паказана «Наталка-Палтаўка». У летапісе тэатра можна прачытаць імёны М. Шчэпкіна, І. Катлярэўскага, І. Патаржынскага, М. Літвіненкі-Вольгемут. Славутыя драматургі, музыканты, мастакі, артысты шчодра аддавалі свой талент гэтаму тэатру і павялічылі яго славу.

Сёння тэатр імя М. В. Гогаля — сапраўды музычны і сапраўды драматычны. Артысты з Палтавы ўпэўнена і натуральна паводзяць сябе ў любых драматычных і камедыйных сітуацыях. Трэба спяваць — калі ласка. Калі ў п'есе лірычная сцэна — і яна іграецца з добрым адчуваннем жанру. Бывае, што артыстам даводзіцца амаль увесь вечар танцаваць — і як жа тэмпераментна, нястомна яны танцуюць!

«Украінскія зоркі» — гэтыя словы мы чулі і ў часе антрактаў, пасля прадстаўленняў славутай «Наталкі-Палтаўкі», і сучаснай п'есы «Пад чорнай маскай».

Артысты прывезлі да нас сапраўды народнае, багатае на фарбы і шматгалосае мастацтва музычнай драмы. Зразумела, можна было б называць прозвішчы артыстаў, майстроў сваёй справы, але лепш за ўсё, мабыць, параіць чытачам схадзіць на спектаклі і самім паглядзець і паслухаць, як тэмпераментна і натхнёна іграюць акцёры з Палтавы. Тут склаўся сапраўды зладжаны ансамбль артыстаў-аднадумцаў, які здольны вырашаць самыя складаныя творчыя задачы.

Палтаўскія акцёры ствараюць яркія характары і вельмі пераканаўча пераўвасабляюцца. Мінчане захапляюцца пранікнёнай ігрой заслужаных артыстаў УССР В. Кажэўнікава, У. Канапацкага, Т. Кісляковай, У. Загаеўскага, падабаецца публіцы харэаграфічная трупа, якая пластычна і «з агеньчыкам» выконвае танцавальныя нумары, гледачы адзначаюць музычны талент вядучых салістаў і хору... Каб лепш падкрэсліць, як палтаўчане працуюць, спашлёмся на такія полюсы іх рэпертуару — сёння ўвечары яны спяваюць і танцуюць у «Запарожцы за Дунаем», а заўтра ўдзельнічаюць у псіхалагічнай драме «Джэні Герхард» па рамане Т. Драйзера, і ўсюды пераконваюць праўдай пачуццяў і сваім «жыццём у вобразах».

Афіша гасцей з Палтавы разнастайная і змястоўная — тут класічныя творы і п'есы, створаныя драматургамі для гэтага тэатра. Цікава, што ў Мінску адбудзецца прэм'ера спектакля «Пакінутая», які тэатр ставіць па сучаснай драме свайго земляка-палтаўчаніна А. Чучы. Гэта — даўняя традыцыя калектыву: даваць «пуцёўку ў жыццё» п'есам, якія не апрабіраваны нідзе і ствараюцца з дакладным адрасам: для Палтаўскага музычна-драматычнага тэатра імя М. В. Гогаля. А назва, напрыклад, новай аперэты «Палтаўскія дзяўчаты» гаворыць сама за сябе. Кампазітар В. Лукашоў напісаў яе на лібрэта Л. Салошына і А. Лук'янава.

Тэатральная зала Дома афіцэраў, дзе выступаюць госці з Украіны, ужо не адзін раз вітала таленавітых артыстаў. А наперадзе — новыя сустрэчы.

П. ДАНЧУК.

НЕ КРЫЎДЗЯЧЫ ПАБЛАЖЛІВАСЦЮ

„МЫ ЖЫВЕМ напружаным творчым жыццём, але зусім адарваліся ад нашых калег, не ведаем, чым і як яны жывуць, на якім ўзроўні працуюць сёння іншыя тэатры рэспублікі, тэатры Мінска», — гэта сказаў артыст Гродзенскага тэатра, народны артыст БССР Я. Кімберг.

«У калектыве ёсць свае крытэрыі, паводле якіх мы ацэньваем уласныя спектаклі і акцёрскія работы. Ці заўсёды мы ставімся да сябе з высокай патрабавальнасцю? Калі быць шчырымі — не, бо часам ідзём на творчыя кампрамісы і іграем на «перыферыйным узроўні», — прызналася з трывогай заслужаная артыстка рэспублікі Л. Сторажава.

«На маю думку, нам пагражае нівеліроўка і, як кажуць, страта свайго аблічча — і ў рэпертуары, і ў манеры рэжысёрскіх вырашэнняў, і ў акцёрскіх трактоўках роляў», — гэта словы заслужанага артыста БССР С. Аляксандрава...

Гастролі Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра ў Мінску прайшлі сёлета даволі паспяхова, асабліва калі яшчэ ўлічыць, што працаваць на сталічнай сцэне давялося адначасова з вельмі сур'ёзным канкурэнтам — драматычным тэатрам імя А. Чэхава з Кішынёва. Мінчане неведалі спектаклі гродзенцаў і пякенска іх прымалі. Фінансавыя і творчыя паказчыкі, здаецца, павінны былі б супакоіць калектыў.

Але не супакоілі.

Праўда, калі ў Доме мастацтваў Беларускае тэатральнае аб'яднанне наладзіла сустрэчу калектыву з прадстаўнікамі тэатральнай грамадскасці, размова спачатку насіла аднабаковы характар. Гаварылі больш крытыкі. І хоць прамовы іх мелі далікатную форму, гаварыліся рэчы не дужа прыемныя. Гродзенцам прад'яўляліся самыя высокія патрабаванні, бо калектыў, які на працягу амаль чвэрці стагоддзя плённа фарміраваў сваё творчае аблічча, выступае цікавым прапагандыстам ідэй часу, варты такіх патрабаванняў. Артысты ж спачатку адмоўваліся. Але тое, аб чым гаварылі Алег Саннікаў, Георгій Колас, Таццяна Арлова, закранала, умоўна кажучы, самую сэрцавіну творчых шуканняў гродзенцаў, і таму размова пакрысе набыла характар дыялогу.

Так, трупа працуе на прафесіянальным узроўні, мае сапраўдных майстроў. Рэжысура імкнецца зрабіць рэпертуар тэатра багатым і разнастайным. Але гастролі ў Мінску і насцярожваюць — ці не губляецца ў калектыве пачуццё адказнасці за кожны выхад на сцэну, ці не зніжаецца мера патрабавальнасці і густу і ў выніку «аптрута правінцыялізму» шкодзіць нават тым спектаклям, якія на прэм'ерах адпавядалі высокім патрабаванням? Мінскія крытыкі аднадушна — прама або ўскосна — вымушаны былі сказаць пра гэта калектыву.

Можна спаслацца на спектакль «Цяжкае абвінавачванне». Драматургічна моцная, канфліктная п'еса ў выкананні гродзенцаў гучыць аблегчаным варыянтам. Мабыць, такога не было на прэм'еры, бо агульны малюнак спектакля, пастаўленага Нінай Алейніч, сведчыць пра тое, што тэатр удумліва прачытаў драму Л. Шэйніна. Але з цягам часу выканаўцы роляў нешта згубілі і, відаць, пайшлі за рэакцыяй глядзельнай залы, націскаючы на сентыментальныя і камічныя месцы, а некаторыя знешне «сумныя», хоць і важныя для агульнага гучання канфлікту сцэны, дзяжурна «адыгрываючы».

Амаль усе ўдзельнікі абмеркавання спасылаліся на вось гэтае «заігрыванне» гродзенскіх акцёраў з глядзельнай залай. Напрыклад, у камедыйных пастаноўках — «Дамы і гусары» і «Раскінулася мора шырока» — некаторыя мізансцэны і артыстычныя прыёмы, як падкрэслівалі А. Саннікаў, наперад разлічаны, каб выклікаць у гледачоў смех. «Запланаваныя рэакцыі», а не думка — вось што часам толькі і клапоціць удзельнікаў спектакляў. Да тэксту ролі выканаўцы, відаць, са згоды пастаноўшчыка Аляксандра Струніна, наўмысна прыплюсоўваюць, — дзеля таго, каб пазабавіць залу, — трафарэтныя інтанацыі, жэсты, «націскаюць», калі даводзіцца іграць фрывольныя пасажы і мізансцэны. Замест імправізацыйнай лёгкасці, якой вымагае жанр камедыі, — пануе камікаванне не надта ж высокага гатунку.

(Пра ігру «на публіку» гаварылася так востра яшчэ і таму, што ў камедыйным спектаклі, які быў паказан у Мінску «не па праграме», — «Вясельнае падарожжа», — тэатр прадэманстраваў добры густ і высокае ўмельства. Вадэвільныя сітуацыі і дасціпныя рэплікі ў гэтым вясёлым відовішчы не «штурхалі» выканаўцаў на злашчаснае «педаліраванне». Немудрагелістая камедыя пастаўлена так, што акцёры літаральна «купаюцца ў ролях», не пераступаючы пры гэтым берагоў жанру і мастацкай мэтазгоднасці. Значыцца, умеюць — і ўмеюць добра!)

Зразумела, ва ўсіх спектаклях гродзенцаў ёсць вобразы, створаныя па-майстэрску. Арганічна паводзіць сябе на сцэне, не паддаючца спакусе сыграць «на публіку» заслужаныя артысты БССР Вітольд Грачынскі, Сямён Аляксандраў, Людміла Сторажава, акцёры Юрый Нікіцін і Уладзімір Дзёмін. Аднак удзельнікі абмеркавання гаварылі больш пра агульную **культуру выканання** роляў у ансамблі. Трупа вызначаецца сваімі акцёрскімі індывідуальнасцямі. Як жа на сцэну прасочваецца рамеснічтва? Прычына тут — і недастатковы рэжысёрскі нагляд за спектаклямі, бо пастаноўшчыкі пасля прэм'еры адразу павінны аддаваць усе сілы і намаганні новым рэпетыцыям (да таго ж і пастаноўшчыкаў толькі двое — А. Струнін і Н. Алейніч), і адарванасць калектыву ад тэатральнага жыцця рэспублікі, і рэдкія сустрэчы з вопытнымі майстрамі сталічнай сцэны, з крытыкамі-прафесіяналамі.

Былі ў час размовы ў Доме мастацтваў і слушныя папрокі ў адрас тэатральнай крытыкі, у прыватнасці, у адрас аўтара артыкула «Дзе пачынаецца мастацтва...» Анатоля Сабалеўскага (гл. «Літаратуру і мастацтва» ад 17 мая г. г.). Драма «Адплата», напісаная і пастаўленая рэжысёрам А. Струніным, мае істотныя хібы, пра якія рэцэнзент чамусьці не сказаў на ўвесь голас. Спектакль, як адзначылі ўдзельнікі абмеркавання, атрымаўся лепшы за драматургічную першакрыніцу, — дзякуючы ўдумлівай рабоце выканаўцаў роляў. Глыбокаму раскрыццю характараў, аднак, замінала нелагічнасць паводзін і ўчынкаў персанажаў п'есы, акцёрам было вельмі цяжка знайсці мастацкае апраўданне для тых схематычных сітуацый, у якія аўтар паставіў дзеючых асоб. Гераіня драмы — Стэфа Станкевіч ідзе на самыя страшныя злачынствы, імкнучыся набыць як мага больш багацця, грошай. Яна выдае ворагам кожнага, хто перашкаджае ёй атрымаць новыя «юдзіны сярэбранікі». Але дзеля чаго жанчына гэта робіць? Нейкая зразумелая прычына такой хцівай страсці (або, гаворачы тэатральнай мовай, «звышзадача» вобраза) павінна ж быць! Яе — няма. Стэфа — «скнара», і больш нічога ў яе істоце аўтар не паказвае.

Або яшчэ адзін персанаж, які, на думку аўтара, павінен быць дзейснай спружынай сюжэта, — Дэмбіцкі. «Абавязкі», ускладзеныя на яго драматургам, так пераблытаны, што ён адначасова выконвае загады... Ватыкана, служыць нямецкаму абверу, (а шпіёніць як дылетант!), моліцца «залатому цяльцу» і да таго яшчэ «муціць ваду» ў доме Станкевічаў! Што тут рабіць акцёру, як пераканаць гледача, што на сцэне дзейнічае жывы персанаж, а не маска!

Замест пераканаўчых чалавечых вобразаў у п'есе выведзены ўмоўныя функцыянальныя фігуры — «увогуле адмоўныя» або «ўвогуле станоўчыя». На сцэне меладраматызм перабліты з патэтыкай, лірычная драма з плакатным відовішчам. І калі артысты Віктар Смачнеў, Якаў Кімберг, Людміла Сторажава і Тамара Нікалаева ўсё-такі дасягаюць пэўнага эфекту, падабенства да праўды — гэта якраз той выпадак, калі натхненнем і ўмельствам удаецца пераадолець рамяство драматургіі.

«Адплата» сыграна гродзенцамі больш як пяцьдзесят разоў. Гэта — «свой» спектакль, створаны ў тэатры. Таму, мабыць, пра яго і вяліся самыя гарачыя спрэчкі. Прадстаўнікі тэатра пагаджаліся далёка не з усімі заўвагамі. Спасылаючыся на касавы поспех «Адплаты», яны гаварылі, што крытыкі часам глядзяць спектакль «з блакнотам на каленях», што па гэтай прычыне шмат чаго не трапляе ў іх поле зроку: маўляў, аднаго прагляду недастаткова, каб заўважыць усе вартасці пастаноўкі.

Прыклад добрай увагі да крытыкі паказаў заслужаны артыст БССР П. Філіпаў, які сказаў, што аўтару п'есы ў калектыве і на мастацкім савеце рабіліся папрокі і ўказвалася на многія творчыя пралікі, але А. Струнін не браў іх пад увагу. Між тым, тэатру варта прыслухацца не да салодкіх ухваленняў, а да прынцыповай крытыкі, якая дбае пра трупу, пра далейшы лёс тэатра. Самападман ніколі не прыносіў у мастацтве плён!..

У абмеркаванні, якое праходзіла ў атмасферы высокай патрабавальнасці і добразычлівасці, удзельнічалі, акрамя названых таварышаў, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР А. Струнін, народная артыстка БССР В. Галіна, заслужаны дзеяч культуры БССР І. Міхалюта, заслужаныя артысты БССР Г. Панкрат і В. Грачынскі, драматург К. Губарэвіч, акцёр У. Дзёмін. Былі выказаны пажаданні, каб БТА часцей наладжвала такія сустрэчы, і не толькі ў час гастроляў. Добра было б, каб гродзенцы і артысты іншых абласных тэатраў рэгулярна атрымлівалі творчыя камандзіроўкі для знаёмства з лепшымі работамі суседзяў.

Трэба спадзявацца, што шчырая прафесіянальная размова пра сённяшні стан аднаго з абласных тэатраў рэспублікі паспрыяе ўздыму творчасці не толькі гэтага калектыву.

В. ІВІН.

ЛЯ НЁМАНСКІХ БЕРАГОЎ

СКАЖУ шчыра, мы ад'язджалі з Гродна стомленыя. Калі назваць лічбы, дык кожны, мабыць, зразумее, чаму. За дваццаць сем дзён Рускі тэатр БССР імя Горкага ў горадзе і вобласці даў шэсцьдзесят чатыры спектаклі. 64 падзяліць на 27, атрымліваецца больш як па два спектаклі за дзень. А гэта значыць, штодзень адна група артыстаў у Гродна, другая — на колах. Маршруты тэатральнага «ЛАЗа» ахапілі амаль усю Гродзеншчыну. Мы ездзілі па «гарачых слядах» Рэспубліканскага фестывалю прафесіянальнага мастацтва, і не раз сустракалі ў вёсках заўзятых тэатралаў, якія дзяліліся з намі ўражаннямі ад фестывальных выступленняў спевакоў і эстрадных калектываў.

Прыемна, што кожны наш прыезд прыцягваў увагу літаральна ўсяго насельніцтва — ад старых да малых. Вядома, тэатру давялося прыстасаваць працу да летняга распарадку вясковага жыцця — пачатак спектакляў пераносіўся на адзінаццаць і нават на «нуль-нуль» гадзін. Раней нельга, бо калгасны працаўнік цэніць летам кожную хвіліну. І толькі калі апусціцца змрок, да імправізаванай сцэны, нібы ручаі, пачынаюць сцякацца гледачы.

У Шчучынскім раёне, у саўгасе «Усход», мы выступалі на трох аўтамабільных кузавах, абсталяваных пад сцэнічныя падмосткі. Навокал — вялізны натоўп. Акцёры старэйшага пакалення ўспаміналі, што прыблізна так мы выступалі ў ваенных умовах, толькі цяпер нашымі гледачамі былі, як кажуць, «салдаты мірнай працы».

Нашы электрыкі наладзілі мікрафоны, як мага лепш асвятлілі «сцэну», — і «Вяселле на ўсю Еўропу» мы сыгралі пад дружны смех і апладысменты. Спектакль закончыўся гадзіны за паўтары да ўсходу сонца, але ніхто не пакінуў «глядзельнай залы».

Між іншым, заўважу, што іграць на такой імправізаванай сцэне нам, артыстам, было ямчэй, чым у некаторых клубах. Чамусьці і да гэтага часу на вёсцы нярэдка будуюцца маленькія нязручныя клубы, у якіх ні дэкарацый самых элементарных не паставіць, ні патрэбнага электраасвятлення не ўстанавіць, ні пакойчыку для грыміравання за сцэнай не знайсці.

Вядома, выступленні ў такіх непрыстасаваных умовах стамляюць. І ўсё-такі як часта мы адчувалі сапраўднае творчае задавальненне! Непасрэдны і ўдзячны, чулы і дасціпны глядач сустракаў трупу Рускага тэатра БССР у Берастовіцкім і Мастоўскім, Ваўкавыскім і Шчучынскім раёнах. Назвы калгасаў і саўгасаў «Авангард», «Першае мая», імя Калініна, «Кастрычнік» цяпер многае кожнаму з нас гавораць, бо тэатр пакінуў там добрых сяброў. Разам з імі мы абмяркоўвалі спектаклі, гаварылі пра надвор'е з клопатам пра ўраджай, а бывала, і сустракалі першыя промні сонца...

«Узнятая цаліна», «Шчыт і меч», «Варшаўская мелодыя», «Вяселле на ўсю Еўропу» — на гэтых спектаклях пабывала больш як пятнаццаць тысяч вясковых гледачоў.

У Гродна мы паказвалі больш «цяжкія» пастаноўкі, якія і афармлены складаней, і займаюць амаль усю артыстычную трупу. У свой час у гэтым горадзе была база Рускага тэатра БССР. Цяпер мы як бы трымалі справаздачу перад даўнімі знаёмымі і перад новымі жыхарамі горада над Нёманам.

Прыемна, што гэтая справаздача прынесла калектыву тэатра пачуццё творчага задавальнення.

Кузьма КУЛАКОЎ,
артыст Дзяржаўнага рускага тэатра БССР імя М. Горкага.

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

ца выстаўкі, чытаюцца лекцыі, прысвечаныя дасягненням балгарскага народа ў будаўніцтве сацыялізма, даклады і гутаркі пра справы карлаўскіх трактаразаводцаў. У сваю чаргу карлаўцы цікавяцца жыццём і працай мінчан, радуюцца іх поспехам. На абодвух заводах адзначаюцца балгарскія і савецкія святы.

Тое ж можна сказаць пра дружбу рабочых Віцебскага дывановага камбіната з рабочымі дывановага-плюшавай фабрыкі ў горадзе Лодзі, калгаснікаў калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна з кааператарамі балгарскай «Боцеўградскай камуны», калектыву Мінскага аўтазавода з рабочымі Чэпельскага аўтамабільнага завода ў Венгрыі.

Сяброўскія адносіны з прадпрыемствамі і ўстановамі сацыялістычных краін падтрымліваюць Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага, Гродзенскі тонкасуконны камбінат, завод «Гомсельмаш», калгас «17 верасня» Нясвіжскага раёна і многія іншыя.

Мацнеюць нашы кантакты з грамадскасцю Францыі, Індыі, Італіі, Фінляндыі, Бірмы, Калумбіі, Новай Зеландыі, Танзаніі і іншых краін.

— Чым своеасаблівы сёлетні год! Што новага ў рабоце Беларускага таварыства дружбы ў сувязі з юбілеем нашай рэспублікі! Як рыхтуюцца адзначыць гэтае свята нашы зарубежныя сябры!

— Давайце азірнемся крыху назад. Летась савецкі народ адзначаў паўвекавы юбілей Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Разам з намі яго адзначала ўсё прагрэсіўнае чалавецтва. У дзесятках краін свету, у сотнях гарадоў Еўропы, Азіі, Амерыкі, Афрыкі і Аўстраліі прайшлі ўрачыстыя вечары і пасяджэнні, арганізаваны выстаўкі, праведзены кінафестывалі, прысвечаныя 50-годдзю Кастрычніка, які адкрыў новую эру ў гісторыі чалавецтва, асвяціў многім народам шлях да свабоднага і заможнага жыцця. Многія з гэтых мерапрыемстваў былі прысвечаны асобным савецкім рэспублікам, у тым ліку і Беларусі. І таму можна лічыць, што нашы сябры за рубяжом пачалі падрыхтоўку да 50-годдзя БССР яшчэ летась.

Так, летась, у сувязі з юбілеем Савецкай улады, у многіх краінах сацыялізма былі прачытаны лекцыі і даклады, наладжаны фотавыстаўкі аб дасягненнях беларускага народа ў развіцці народнай гаспадаркі і культуры пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Беларусі былі прысвечаны спецыяльныя кіна-, тэле- і радыёпраграмы.

Рад мерапрыемстваў, прысвечаных менавіта нашай рэспубліцы, правялі сёлета актывісты таварыстваў дружбы з Савецкім Саюзам у Бельгіі, Алжыры, Камбоджы, Танзаніі, Мексіцы, Італіі, Індыі.

Пра сённяшні дзень Савецкай Беларусі гаварылася на вечарах, якія праводзіліся летась, у сувязі з гадавінай Кастрычніка, патрыятычнымі арганізацыямі суайчыннікаў у зарубежных краінах, такімі, як Федэрацыя рускіх канадцаў, Саюз савецкіх грамадзян у Бельгіі, Рускі дэмакратычны саюз у Фінляндыі, Рускі грамадскі клуб у Сіднеі, Рускі клуб «Радзіма» ў Аўстрыі, Саюзы суайчыннікаў «Бярозка» і «Рамонак» у ФРГ, клубы суайчыннікаў у Аргенціне і Уругваі.

Відаць, варта напомніць і дні Беларускай ССР на Сусветнай выстаўцы ў Манрэалі. Тысячы турыстаў з розных краін свету мелі тут магчымасць пабачыць тое, чаго дасягнуў беларускі народ за гады Савецкай улады, паглядзець і паслухаць выступленні беларускіх мастацкіх калектываў.

Ну і, вядома, нельга не ўспомніць тое, што летась у Францыі прайшлі дні беларускай культуры, а ў Беларусі — дні французскай культуры. Больш чым у сарака гарадах і дэпартаментах Францыі адзначаліся дні беларускай культуры. Канцэртная група, якая складалася з салістаў Беларускага тэатра оперы і балета і танцавальнай групы народнага хору БССР, выступала ў Парыжы, Грэноблі, Туры, Ліёне, Рэне і іншых гарадах. Яна дала 29 канцэртаў, на якіх прысутнічала каля 40 тысяч французскіх гледачоў. За час дзён беларускай культуры ў Францыі пашырыліся нашы сувязі і кантакты з многімі дэпартаменцкімі і гарадскімі аддзяленнямі Таварыства «Францыя — СССР».

Сёлета мы загадзя склалі план асноўных мерапрыемстваў у сувязі з 50-годдзем БССР і Кампартыі Беларусі, каб дапамагчы нашым зарубежным сябрам найлепш адзначыць разам з намі гэтыя гадавіны.

З сацыялістычных краін юбілей Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі найбольш шырока адзначаць працоўныя народнай Польшчы. Гэта і натуральна. Польшча — наш бліжэйшы сусед. У гарадах і пасёлках Польскай Народнай Рэспублікі будуць праведзены святочныя вечары, наладжаны выстаўкі, прачытаны гутаркі і даклады аб Беларусі. Спецыяльныя мерапрыемствы будуць прысвечаны дасягненням у развіцці навукі і тэхнікі БССР за гады Савецкай улады.

НАШ ПАЧЭСНЫ ПАСАД МІЖ НАРОДАМІ

Каб гэтыя мерапрыемствы прайшлі паспяхова, мы накіроўваем польскім сябрам інфармацыйныя матэрыялы, фотавыстаўкі, разнастайную літаратуру. У Польшчы пабывае дэлегацыя Беларускага таварыства дружбы і Беларускага аддзялення таварыства савецка-польскай дружбы, а таксама спецыяльная група турыстаў з Беларусі, удзельніцы якой выступяць з лекцыямі і гутаркамі перад грамадскасцю Польскай Народнай Рэспублікі.

50-годдзе БССР шырока адзначаць разам з намі і нашы шматлікія сябры ў Балгарыі, Венгрыі, Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы, Чэхаславакіі, Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы, Манголіі. Па шырокай праграме ў гэтым месяцы ў Беларусі пройдуць дні В'етнама, а ў кастрычніку — дні БССР у ДРВ.

Цесная дружба ўстанавілася паміж Беларуссю і індыйскім штатам Майсор. Сёлета, у сувязі з юбілеем, у Майсоры будзе праведзены фестываль беларускіх кінафільмаў. Мы рыхтуем для адпраўкі аддзяленню Таварыства інда-савецкай дружбы ў Майсоры 3—4 мастацкія і 5—6 дакументальных стужак, зробленых беларускімі кінематаграфістамі. У дні фестывалю Майсор наведае і дэлегацыя работнікаў нашага кінамастацтва.

Эстафету дзён беларускай культуры ў зарубежных краінах з Францыі прыме сёлета Бельгія. Наша таварыства накіроўвае ў Бельгію шмат разнастайных матэрыялаў, у прыватнасці, экспанаты дзвюх выставак — «Беларуская графіка» і «Беларускае мастацкае шкло», узоры мастацкай творчасці нашага народа, выстаўку дзіцячага малюнка, некалькі фотавыставак і фотападборак, якія адлюстроўваюць дасягненні народнай гаспадаркі, навукі, культуры і мастацтва Савецкай Беларусі. Акрамя гэтага, бельгійская грамадскасць у дні беларускай культуры зможа пазнаёміцца з беларускімі мастацкімі і дакументальнымі кінастужкамі.

Рад мерапрыемстваў, прысвечаных 50-годдзю БССР, будзе праведзены ў Аўстрыі. Для ўдзелу ў іх туды выедзе спецыяльная дэлегацыя Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі.

У культурных цэнтрах Саюза Савецкіх таварыстваў дружбы ў Каіры, Дамаску, Марока і Бялградзе будуць праведзены вечары, наладжаны выстаўкі, прысвечаныя святу беларускага народа.

Нам вядома таксама, што адзначыць 50-годдзе БССР рыхтуюцца актывісты Таварыства «Фінляндыя — СССР», Таварыства «англа-савецкай дружбы» і грамадскасць Японіі. Ім мы высылаем выстаўкі беларускай графікі і малюнкі беларускіх дзяцей.

Пералічыць усе арганізацыі і аддзяленні зарубежных таварыстваў дружбы з Савецкім Саюзам, якія мяркуюць адзначыць паўвекавы юбілей БССР, немагчыма. Таму зноў назаву дзве лічбы. Вечары дружбы, фотавыстаўкі, паказы кінафільмаў, лекцыі і даклады, прысвечаныя Беларусі, будуць праведзены ў 170 розных арганізацыях амаль 50 краін.

Ім мы таксама рыхтуем шмат матэрыялаў. Некаторыя з гэтых матэрыялаў ужо адпраўлены, іншыя мы падбіраем і апрацоўваем. Сярод іх — лічбы і факты для дакладчыкаў. Буйнафарматныя фотавыстаўкі «Савецкая Беларусь за 50 гадоў» і «50 гадоў архітэктуры Савецкай Беларусі», 12 назваў тэматычных падборак артыкулаў, 4 інфармацыйныя бюлетэні «Савецкая Беларусь сёння», дакументальныя кінафільмы, грампласцінкі і магнітафонныя запісы лепшых народных музычных твораў і твораў беларускіх кампазітараў, беларускія сувеніры і г. д.

Сёлета мы чакаем прыезду шматлікіх дэлегацый з розных краін свету. Амаль штодня ў Беларусь прыязджаюць разнастайныя турысцкія групы. Мы імкнемся, каб замежныя госці маглі наведаць нашы прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы, калгасы і саўгасы, сустрэцца і пагутарыць з савецкімі калегамі па прафесіі, пабываць на вечарах, паслухаць гутаркі і даклады, паглядзець кінафільмы, прысвечаныя юбілею БССР. Карацей, зрабіць усё для таго, каб зарубежныя турысты і госці рэспублікі маглі як паўней пазнаёміцца з Беларуссю, з жыццём, працай і адпачынкам нашага народа.

— А нашы суайчыннікі за мяжой?

— Для іх, як вядома, выдаецца ў нас газета «Голас Радзімы». Сёлета ў газеце заведзена спецыяльная рубрыка — «50 год БССР». Пад гэтай рубрыкай мы змяшчаем самыя розныя матэрыялы, якія расказваюць аб поспехах беларускага народа за 50 савецкіх гадоў. Нашы суайчыннікі сустракаюць гэтыя матэрыялы з цікавасцю. Мы атрымліваем з-за рубяжа шмат пісем.

Дарэчы, у гэтым месяцы мы чакаем у госці групу дзяцей нашых суайчыннікаў. 28 хлопчыкаў і дзяўчынак з Англіі, Галандыі, ФРГ, Францыі, Фінляндыі будуць адпачываць разам з савецкімі дзецьмі ў піянерскім лагеры «Лясная казка»...

— Хочацца, — гаворыць у заключэнне Віталь Сцяпанавіч, — зноў нагадаць словы нашага бессмяротнага песняра. Памятаеце, у Янкі Купалы ёсць такія радкі, напісаныя яшчэ да рэвалюцыі:

Занімай, Беларусь маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі!

У іх — страснае жаданне паэта бачыць Беларусь маладой, вольнай, роўнай сярод роўных народаў. Сёння мы з поўным правам можам сказаць, што гэтае жаданне, гэтая мара песняра збыліся. За пяцьдзесят савецкіх гадоў Беларусь ператварылася ў квітнеючую індустрыяльна-аграрную рэспубліку, яна заняла свой пачэсны пасад між народамі. Сведчанне гэтаму — яе прызнанне народамі свету, яе дружалюбныя сувязі з дзесяткамі краін Азіі, Еўропы, Амерыкі, Афрыкі. Сведчанне гэтаму і тое, што юбілей Беларускай Савецкай Рэспублікі знаходзіць у свеце такі шырокі водгук.

Г. МАЗУРАЎ. Год прадразвёрстні (масла).
З дыпломных работ выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута.

ЧЫТАЧЫ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ

△ Пры рэдакцыі рэчыцкай газеты «Дняпровец» працуе літаратурна-музычнае аб'яднанне. Яго члены часта сустракаюцца з працоўнымі горада і вёскі. А гэтымі днямі члены аб'яднання пабывалі ў сельгасарцелі імя Фрунзе Рэчыцкага раёна. Яны прачыталі свае вершы выканалі песні. Аб рабоце аб'яднання расказаў супрацоўнік газеты Ігар Сіняўскі.

П. КРУК.

△ У Брэсце з'явіліся афішы, якія паведамляюць аб гастролях Калужскага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя А. В. Луначарскага. Учора яны пачалі свае выступленні спектаклем «Людзі, якіх я бачыў» па п'есе лаўрэата Ленінскай прэміі Сяргея Смірнова. У рэпертуары тэатра 13 п'ес савецкіх і зарубежных аўтараў.

С. ГУСЕЎ.

△ У Маладзечанскім Доме культуры чыгуначнікаў адбылася канферэнцыя чытачоў па кнізе «Партызаны Вілейшчыны» І. Клімава і Н. Гракава. Больш за 500 чытачоў прыйшло ў Дом культуры, каб падзяліцца ўражаннямі аб прачытаным, успомніць свае баявыя паходы. У канферэнцыі прынялі ўдзел аўтары кнігі.

У. МАНГІНОВІЧ.

△ У гарадскім пасёлку Дзятлава ідзе будаўніцтва раённага дома культуры. Тут будзе глядзельная зала на 400 месц, стацыянарная кінаўстаноўка, пакоі для работы гурткоў мастацкай самадзейнасці. Новае памяшканне выраша на здаць у эксплуатацыю да 50-годдзя БССР.

К. САНЬКО.

Сярод кніг

ДЗЕНЬ ПРАЖЫТЫ І ПЕРАЖЫТЫ

Янка Сіпакоў сваю трэцюю кнігу вершаў назваў «Дзень». Ён паспрабаваў даць не проста зборнік вершаў, напісаных за пэўны час, а цэласную па структуры і праблематыцы кнігу, у якой не павінна быць нічога лішняга і выпадковага.

«Дзень» — у паэтычнай інтэрпрэтацыі Я. Сіпакова—гэта і звычайны дзень, час ад усходу да заходу сонца, і нешта большае, шырэйшае, дзень чалавечых здзяйсненняў, час яго думак і спадзяванняў.

Тры раздзелы кнігі так і названы: «Мелодыя першага промня», «Вышыня поўнага сонца» і «Вечаровая мудрасць дрэў». Знешне ўсё як быццам правільна: дзень пачынаецца з раніцы, пасля наступае поўдзень і, нарэшце, вечар. Але адна справа дзень як частка сутак і зусім іншае—як пэўны адрэзак чалавечага жыцця. Ці ўсюды знойдзена аўтарам паміж імі паэтычная аналогія? На жаль, далёка не заўсёды і не ўсюды.

Скажам, заканчваецца дзень — памірае чалавек. Паэт спрабуе прыпадабніць гэтыя з'явы: «Вы кажаце, ён памёр? Не! Ён проста стаміўся—адпачыць прылёг між разор, павярнуўся тварам да зор, каб неба напіцца». Аднак прыпадабненне гэтае штучнае, нацягнутае...

Сувязь паміж раздзеламі кнігі недастаткова арганічная, размеркаванне вершаў часам адвольнае. Сапраўды, чаму, напрыклад, «Вечаровая песня лесаўчыка» змешчана не ў «вячэрнім» цыкле, а ў «Вышыні поўнага сонца»?

Знешняя тэма кнігі—«дзень». І аўтару не адмовіш ва «ўсеабдымнасці» адлюстравання «дня»: ён піша пра самае рознае—ад звычайнага лісіцка, траўкі-мураўкі да «выступлення Зямлі на канферэнцыі па раззбраенню». Але якая ўнутраная тэма, які пафас спалучае ўсе вершы Я. Сіпакова ў адзіную цэласную кнігу? Нам здаецца, што такой тэмы няма.

У зборнік, трэба шчыра сказаць, уключана шмат вершаў няспелых, недасканалых, многія з іх нельга назваць самастойнымі творамі, яны адыгрываюць службовую ролю «масткоў», «мацаванняў» паміж асобнымі часткамі кнігі. Такія амаль усе ўступы і заключэнні да цыклаў. Так, напрыклад, кніжка, як і след было чакаць, адкрываецца «Запрашэннем у раніцу». Верш уражвае пачуццёвай канкрэтнасцю, ён насычаны свежымі дэталямі: «паколаты яловымі лапкамі, выходзіць з лесу густы туман, якім накрываліся зайчаняты ночу», «адсырэлыя за ноч жалейкі», «нібы тварык твайго смяшлівага сына... выглядвае, як з-пад коўдры, з-за лініі гарызонту сонца» і г. д. Але гэтым дэталям не ўдаецца вырасці да важкіх вобразаў-сімвалаў, і верш не ўзнімаецца да пэўнага мастацкага абагульнення, ён—толькі своеасаблівая прыступка для ўваходу ў кнігу...

Тым не менш, многае ў «Дні» запамінаецца і ўражвае. Адчуваецца, што Я. Сіпакоў, як і некаторыя яго равеснікі, імкнецца пераадолець у сабе тэматычную і эстэтычную аднастайнасць, вырвацца на прастор новых патрабаванняў. Гэтыя прыметы абноўленага стылю, «другога нараджэння» паэта, думаецца, прысутнічаюць у яго трэцяй кнізе. Самыя яркія з гэтых прыкмет — мастацкая ўмоўнасць і свабодны верш.

Мастацкая ўмоўнасць (як эстэтычнае пераўтварэнне свету) арганічна ўласціва паэтычнаму мысленню Я. Сіпакова. Бо, як прыкмецілі мы, у аснове творчага акту паэта ляжыць радасць пазнання жыцця, здзіўленне перад яго разнастайнасцю і багаццем, нават, мы б сказалі, нейкая дзіцячая першаснасць успрыняцця рэальнага свету. Але і на гэтым шляху мастацкага пераўтварэння рэчаіснасці бываюць у паэта ўзлёты і падзенні. Рэчы, з'явы бачацца яму ў якімсьці нечаканым ракурсе, ён бывае ўражаны, здзіўлены гэтым і спяшаецца «зарэгістраваць» сваё здзіўленне на паперы. Менавіта са здзіўлення часцей за ўсё і пачынаецца ў яго рэалізацыя паэтычнай задумы. Нярэдка, на жаль, на здзіўленні ўсё і канчаецца, асабліва, калі аўтар не перажыў, не «перамучыўся» той ці іншай з'яваю, а толькі здзівіўся.

Капяжу застылыя гукі
У марознай аціхнуць цішы —
Можна браць тады ў цёплыя рукі
Гукі.
Злоўленыя ў ледзяшы...
Нібы рыбу ў замарожаным выглядзе.

Лірычная тэма тут не разгортваецца, важкіх думак і наогул паэтычнага асэнсавання з'явы няма. Ёсць толькі вымучаная «прыдумка»: гукі-ледзяшы падобны на замарожаную рыбу.

Бракуе непасрэднасці і шчырасці і «Малітве». Яна занадта аднатонная, у ёй няма «пераліваў», нарастання ці спаду думак-пачуццяў, лірычны герой тут зарана пачаў тлумачыць свайму немаўляці, каму яно павінна быць удзячна за сваё нараджэнне, чаму і адкуль яно з'явілася на свет.

Прыкладамі такіх жа пазбаўленых паэзіі, сканструяваных вершаў з'яўляюцца таксама «Трава — мядзведзь мядзведзем», «Птушаня», «Самадзержац», «Світальнае», «Вітанне, раніца!» і інш.

Здраджвае аўтару густ і ў «Цнатлівым жарце». Увесь жарт заключаецца ў тым, што сарамлівыя закаханыя ніяк не могуць пацалавацца, а вось заяц не сароміцца—цалуе зайчыху.

Паэзія прыходзіць да Я. Сіпакова тады, калі з'явы рэчаіснасці схоплены ім у момант найпаўнейшага праяўлення іх унутранага багацця, іх сутнасці. Вось як, напрыклад, перададзена імкненне дзяўчат да кахання, да мацярынства, тое, як гэтыя пачуцці і жаданні прачынаюцца ў іх:

Нібы бліскавіцы белыя.
Сок застукаўся ў голле з сілаю,
І, калісьці такія нясмелыя,
Чырванеюць дзявочыя сны...
Лопаецца
недзе за небасхіламі
Сонца—
пупышка вясны.

Гэта гучыць натуральна і паэтычна. Чалавек і прырода «паразумеліся» і адлюстраваліся адно ў адным.

Паэт становіцца на абарону першароднасці жыцця, яго матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, якім сёння часам пагражае раўнадушша і рацыяналізм. Уражвае шчодрасць і шырыня натуры лірычнага героя, яго шчырая гасціннасць, закаханасць у зялёнае царства зямлі і яе мінулае, аж да «язычаскай» апантанасці: «Хоць продкі здаўна мае хрышчоныя, ва мне язычнік не памірае...»

Але, здараецца, сам паэт трапляе ў палон таго ж раўнадушша і рацыяналізму:

З зямлі
Нам забываюцца не трэба.
Уціснутым між прасторамі,—
Бы жытняе поле, неба
Красуе ўраджайна зорамі.
З неба
І, бачыць таксама трэба.
Узняўшыся над прасторамі,—
Жытняе поле,
бы неба,
Красуе роснымі зорамі...
(«Хлебная сувязь»).

Хіба ж можна падмяняць паэзію, пачуццё сухім маралізатарствам?

А ўмее ж Я. Сіпакоў пісаць чалавечна і хораша, ну хаця б пра кветкі, якія «на вясельнай фаце, што вісіць ля шырокага ложка, спяць без просыпу... Яны дужа стаміліся...» Альбо прыгадаем верш «Патоп» — верш-посмешку ўлюбёнага ва ўсё жывое і светлае чалавека. Пры знешняй марудласці лірычнага дзеяння верш валодае ўнутранай дынамікай: разам з нарастаннем «прыемнага патопу» — паху капусты, скваркі, куляшу, кілбасы—нарастае і лірычнае напружанне:

Аж свярбяць насы ад такога патопу.
На яні раздобрылася сялянская печ...

І нарэшце, як збавенне, як выратавальны круг, бацькоўскае:

— Дзеці, за стол!

Верш разгортваецца ў форме разгадвання загадкі, адгадка звычайна ў канцоўцы. Такі прынцып пабудовы верша мае сэнс тады, калі ў працэсе развіцця раскрываецца чалавечы характар, калі адгадка варта загадкі. У дадзеным выпадку—у «Патопе»—варта.

Бывае ж і інакш. Так, у вершы «Мая хата ўзімку расянай палянай зрабілася»... Я. Сіпакоў спачатку малюе карціну птушынага лесу, а ў канцы гаворыць, што мы не ў лесе, а ў пакоі—слухаем пласцінку. Вось вам і ўся адгадка. Міжволі пытаеш сябе: «Ну і што?»

Аўтар мае рацыю, калі шукае паэзію ў звычайным. Шкада, аднак, што ён, стараючыся знайсці паэзію, часам робіць гэтае звычайнае знарок вычурным, нібы ставіць рэчы з ног на галаву. Дзяўчына бяжыць па зямлі, як па барабану (верш «Калі заблытаецца ў тваіх валасах вясна...»). А дзеля чаго бяжыць? Мусіць, толькі дзеля таго, каб паэт мог сказаць: от бачыце, як я ўбачыў гэтую самую дзяўчыну...

Паэзія, вядома, не заўсёды адкрывае новыя думкі, ідэі. Даволі, каб свежым, асабістым было пачуццё аўтара. Гэтую свежасць знаходзім мы ў вершы Я. Сіпакова «Вечаровая песня лесаўчыка». Разнастайнасць рытмамелодыкі, адгалоскі старадаўніх песень і зваротаў, лірызм—усё гэта жыве ў вершы, рухаецца, зліваючыся ў непаўторнае адзінства. Колькі драматызму ў асабістым лёсе лесаўчыка, колькі шкадавання па родным, што засталося недзе далёка-далёка, так далёка, што не можа нават і прысніцца.

Маці, мая ты кукуля.
Прысніся свайму Тамашу!
. . . . . .
Каханая, штодзень прашу.
Рагнеда! Дзе ты? Паслухай—
Прысніся свайму Тамашу!
. . . . . .
Валошка... Валошка з радзімы,
Прысніся хоць ты Тамашу...

Лірычнае ўзрушэнне яшчэ болей падкрэсліваецца рэфрэнамі-прыпевамі, гукапісам, рыфмай...

Але найбольш утульна адчувае сябе ўмоўная асацыятыўнасць паэта ў свабодным вершы. Паслухайце, як звонка зроблена, напрыклад, гэтая разгорнутая метафара:

Неба—блакітны звон.
А ў ім, як падвешаны, жаўранак
Б'е ўтрапёна маленькімі
крыльцамі
Па крыштальных сценках.
(«Паядынак»).

Адсутнасць рыфмы тут не заўважаецца.

І, наадварот: рыфмаваныя вершы ў Я. Сіпакова часта гучаць як свабодная, нязмушаная размова, і добра, калі ў такой размове ёсць паэзія: «І плавяцца званы, бы воск. І кропелькі—маленькія званочкі—у жар звіняць і падаюць, і падаюць...» Ствараецца выразны эмацыянальны малюнак — «разгон» для лірычнага перажывання.

На жаль, побач са свабодай і раскаванасцю, у Я. Сіпакова сустракаецца і звычайная расхлябанасць, неахайнасць:

Цішыню рэпрадуктар ганяе
Па завулках усіх гарадка.
Бусел ліпу сваю аблятае—
Як калісьці, жыве тут птах.

Прыгадваюцца словы А. Пушкіна, сказаныя, здаецца, Жукоўскаму: «А што, калі гэта проза...» Празаізацыя паэтычнай мовы — частая з'ява ў вершах Я. Сіпакова. Праўда, іншы раз яна апраўдана: лірычны пафас унутрана патрабуе свайго «зніжэння», каб не агрымалася занадта ўзнёсла (вершы «Патоп», «Паядынак» і інш.). У іншых выпадках паэт лічыць за лепшае перайсці да звычайнай рытмамелодыкі, да рыфмы:

Чуеце
Кволы стукаюць дзюбы?..
Гэта ўпарта.
Бы камнярубы.
Працуюць нядаўнія эмбрыёны.
Акно прабіваючы ў свет зялёны.
І ўсё ж паддаецца бетон
шкарлупіны —
У пушчы радзіны!

Тут рыфмы, гукі, сапраўды, працуюць, бы камнярубы...

Я. Сіпакоў (і гэта неаднойчы адзначалася крытыкай) увесь у пошуках. На жаль, пошукі гэтыя пакуль што тычацца толькі формы. А паэту, нам здаецца, трэба было б пачынаць пошукі не з формы, а са зместу. Тэматычная і жанравая разнастайнасць не можа замяніць шырыні і акрэсленасці светапогляду, грамадскіх і чалавечых даляглядаў. Пакуль што іменна гэтага нестае маладому паэту. Ён быццам знарок пазбягае вострых сацыяльных праблем і канфліктаў. У яго быццам няма нічога набалелага, таго, што рвецца, просіцца з душы, што магло б усхваляваць, крануць іншых.

Дзень, **пражыты** паэтам, яшчэ не стаў днём **перажытым**. Шмат з таго, што адбылося **за дзень**, засталося паэтычна не асэнсаваным, не ўвайшло ў душэўны вопыт аўтара. А толькі перажытае нараджае сапраўдную паэзію.

Ул. ГНІЛАМЁДАЎ,
І. ШПАКОЎСКІ.

Янка Сіпакоў. «Дзень». Лірыка. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1968.

Міхайла ГРАМЫКА

ТАКІМ Я ПОМНЮ ЯГО...

Паслязаўтра спаўняецца 86 гадоў з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Беларускі народ шануе памяць песняра, ашчадна збірае і беражліва захоўвае ўсё, што звязана з яго светлым воблікам.

У Літаратурны музей Янкі Купалы штогод паступае шмат новых дакументаў. Гэта — невядомыя раней альбо рэдкія фотаздымкі песняра, публікацыі купалаўскіх вершаў на розных мовах, успаміны людзей, якія ведалі яго ці сустракаліся з ім. У музеі захоўваюцца пісьмы М. Ісакоўскага, І. Эрэнбурга, Л. Нікуліна, народнага паэта Чувашыі С. Эльгера, украінскіх пісьменнікаў П. Панча і Т. Масэнкі, у якіх ёсць звесткі аб жыцці і літаратурнай дзейнасці Я. Купалы. Нядаўна паступілі ў музей пісьмы ад армянскіх пісьменнікаў Н. Зар'яна і Г. Маары, пенсіянеркі А. Паляковай, якія ў свой час сустракаліся з песняром Беларусі.

Прапануем увазе чытачоў успаміны пра Янку Купалу (з некаторымі скарачэннямі) старэйшага беларускага пісьменніка Міхайлы Грамыкі.

Іван Дамінікавіч Луцэвіч... Не, не! Занадта афіцыйна, пашпартоўна!

Янка Купала, народны паэт, праслаўлены далёка за межамі Айчыны сваёй і сам праславіўшы яе, — гэта значна бліжэй да сутнасці таго, пра каго гаворка. Дадаць толькі яшчэ два словы, словы якія ідуць ад самога сэрца чалавека, што меў шчасце жыць побач з ім, гутарыць з ім, бачыць яго чароўную ўсмешку!..

Першае маё спатканне з Янкам Купалам адбылося праз некалькі дзён пасля майго пераезду з Адэсы ў Мінск у 1921 годзе.

Я ўглядаўся ў мужчыну сярэдняга росту, добра складзенага, у росквіце гадоў і здароўя. Рысы твару, колер валос, позірк — тыповыя для значнай часткі беларусаў. Лоб... Лепш назваць яго старым, але больш выразным словам — «чало». Досыць было раз-другі зірнуць на гэтае чало, каб упэўніцца: там, у падкоркавых тайніках павінны хавацца да часу думкі і пачуцці, якія пазней вобразамі слоў асядуць у сэрцах тысяч людзей!

І гэтая ўсмешка! Тады яна лёгкай хвалькай бегла ад вачэй да вуснаў. Пазней, праз колькі год, усмешка ягоная набыла нязвычную сталасць, глыбіню з адценнем суму і нейкай нібы адказнасці. Яна сведчыла аб яго закончанай усвядомленасці сваёй выдатнай ролі ў справе станаўлення нацыянальнага аблічча народа, з нетраў якога ён выйшаў. А. П. Чэхаў выказаўся ў адным з лістоў у час хваробы Льва Талстога прыкладна так: «Страшна падумаць, што Талстой можа памерці! Пакуль ён жывы, не сорамна быць рускім пісьменнікам. Пры ім не падыме галавы ў нашай літаратуры ніводзін прахвост!»

Так прыкладна адчувалі сябе пры Янцы Купале ўсе нашы пісьменнікі. Мы як бы знаходзіліся пад дбайнай, несупыннай аховай яго маральнага аўтарытэту, яго геніяльна-праўдзівага натхнення.

У побыце Янка Купала быў заўсёды ветлівым, гасцінным чалавекам. Блізкіх яму душэўна людзей ён зваў з адценнем сяброўскага жарту. У добрым настроі вітаў мяне: «Гром-Грамыка! Гжым-Гжымайла!» Мы былі для яго: Міхайла, Кастусь, Язэп, Алесь. Дзеці падыходзілі да Янкі Купалы як да роднага. Заўсёды радасна сустракалі яго ў дзіцячых дамах. Ён умеў пасмяшыць малое, забавіць яго. Нашу трохгадовую дачушку ён бавіў напеўкай: «Ідзе каза рагатая, бадзе дзіця пузатае!» Пры гэтых словах наставіць два пальцы рожкамі ў жываток. Дачушка заходзілася смехам.

У 1922—23 гадах мы з жонкай перажывалі пэўныя псіхалагічныя і бытавыя цяжкасці. І ў гэты час Янка Купала і яго добра ўсім вядомая спадарожніца - дружына Уладзіслава Францаўна аднесліся да нас з поўным разуменнем. Па аналогіі са старым народным укладам яны сталі для нас як бы «пасаджонымі бацькамі». У той дзень, калі мы распісаліся ў ЗАГСе і звярнуліся на сваю звыш сціплую кватэрку, да нас прыехалі Янка Купала, супрацоўнік Інбелкульта геолаг Мікола Азбукін, супрацоўніца Дзяржаўнай бібліятэкі Юлія Бібіла.

Азбукін прынёс буханку белага хлеба, Бібіла — букецік кветак, а Яначка паклаў на стол дванаццаць вялізных яблыкаў і пры гэтым даў сваім прыемна-басавітым голасам «бацькоўскі» наказ: «Каб столькі дзетак».

Памятаю і вялікдзень 1923 года. У гэты дзень да нас, маладажонаў, нечакана прыйшлі Янка Купала і Якуб Колас. Мая гаспадыня ставіць на стол папашнічкі (дзесьці дастала мукі!), віно, нарэзае вяндліну і кладзе на талерку рэдзьку ў мёдзе! Злучэнне «рускага куліча» і яўрэйскіх ласаў выклікае агульную вясёласць. Асабліва шчыра прыняў рэдзьку Яначка, як навіну для вялікадня. Збянтэжаная спачатку гаспадыня крыху супакоілася. Але новая бяда: пачалі есці вяндліну, ды куды там! Зубы не бяруць! Тут выручыў гаспадыню Якуб Колас: патрабаваў патэльню, распаліў «прымус» і праз нейкі час вяндліна зрабілася ядомай.

Пры ўсёй усвядомленасці той ролі, якую адвяла яму гісторыя ў культурным развіцці свайго народа, Купала заставаўся заўсёды сціплым. Памятаю яго дагледжаную хату ў далённай частцы горада. Вакол хаты — сад, які гаспадар сам абходжваў. Пакояў у хаце чатыры. Адзін займала маці. Невялічкая гасціная ператворана ў кабінет, рабочы стол стаяў і ў прасторнай спальні. Значна большы пакой займала сталовая, што выразна сведчыла: госці займаюць у жыцці гаспадароў не малое месца. А наогул: падаруй Янку «пышны» палац (дарэчы, ці не варты ён быў такога?), Купала астаўся б самім сабой. Ён не цураўся культурных умоў жыцця, таго, што вызначаецца словам «камфорт», але ніколі не маліўся на яго.

Неяк здарылася, што беларуская грамадскасць не ўпільнавала дату 25-годдзя літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы. Зранку звоніць мне на службу телефон: «Дзядзька Грамыка! Спешна трэба даць у газету пра Купалу... Праспалі!..» Я быў крыху збянтэжаны... Але праз 2—3 гадзіны быў перапісаны і адасланы ў рэдакцыю верш «Янку Купалу», у той жа дзень надрукаваны ў газеце (здаецца, «Савецкая Беларусь»).

У 1942 годзе я жыў з сям'ёй у раённым сяле Удмурціі. Увеходжу ў пакой, падаю жонцы газету з аб'явай аб смерці Янкі Купалы. Яна толькі ўсклікнула: «Дай хоць прысесці!» І бяссільна апусцілася ў крэсла...

Пра народнага паэта зямлі беларускай напісаны і яшчэ пішуцца тамы даследаванняў. Хай і гэтыя мае нататкі пра тое, што запомнілася назаўсёды, будуць толькі штрыхамі да партрэта майго вялікага сучасніка.

Малюнкі мастака В. Кандзра да кнігі І. Васілеўскага «Птушыная трывога», якая выходзіць у выдавецтве «Беларусь».

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

ВУЧОНЫ І ПІСЬМЕННІК

ІВАНУ МЯЛУ—50 ГАДОЎ

Споўнілася 50 гадоў празаіку і вучонаму, супрацоўніку Інстытута ветэрынарыі АН БССР Івану Ільічу Мялу. Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР наніравала юбіляру віншавальнае прывітанне наступнага зместу:

«Паважаны Іван Ільіч! Сардэчна віншуем Вас з 50-годдзем з дня Вашага нараджэння.

Вы ўвайшлі ў нашу пісьменніцкую сям'ю не так даўно. Увайшлі, маючы за плячыма багаты жыццёвы багаж і немалы вопыт літаратурнай працы. Прыемна адзначыць, што Вы паспяхова спалучаеце навуковую работу з літаратурна-мастацкай дзейнасцю. Чытачам нашай рэспублікі, як і ўсесаюзнаму чытачу, вядомы Вашы раманы «Нізоўскія партызаны», «Вернасць», аповесці «Пярэдні край», «Быцёнь», асобныя апавяданні і нарысы.

Жадаем Вам, Іван Ільіч, добрага здароўя, доўгіх год жыцця, новых поспехаў як у навуковай, так і ў літаратурнай дзейнасці».

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага прывітання і шчыра жадае юбіляру доўгага жыцця і плённай працы.

1918 год. Самы цяжкі год для маладой Савецкай рэспублікі. Цяжкі і складаны быў ён і для мясціны, дзе я нарадзіўся, — для таго куточка нашай краіны, дзе сыходзяцца цяпер граніцы Беларусі, Украіны і Расіі. Тут ў 1918 годзе была так званая нейтральная дэмаркацыйная паласа. Але на нейтральнай паласе не было нейтральных. Барацьба за зямлю і за хлеб раскалола вёску. Адны падаліся ў рэвалюцыйны багунскі полк, другія — да гайдамакаў, трэція — проста ў бандыцкія шайкі...

У аснову рамана «Раскол», над якім я цяпер працую, леглі і ўспаміны ўдзельнікаў тагачасных падзей, расказы маіх землякоў, дакументы і мая любоў да зямлі і людзей, сярод якіх я вырас, да іх песень, побыту, жыцця.

Прапаную ўвазе чытачоў «Літаратуры і мастацтва» старонкі з рамана.

Аўтар.

СТАЦЬ НОЧ — сырая, адліжная. Ные рана ў Макара Нябабы. І не спіца Макару. Паранілі яго пад Злынкай. Аднеслі чырвонагвардзейцы свайго ўзводнага ў эшалон, які вёз абсталяванне гомельскіх чыгуначных майстэрань. Эшалон пайшоў на Бранск, а Макара высадзілі — згрузілі на Унечы. Паклалі ў перапоўненую мясцовую бальніцу. Паляжаў некалькі дзён Макар у калідоры на канапе. Калі рана на сцягне зацягнулася сіняватым рубцом, зрабіў сам сабе ўзводны мыліцу і зімой—ад вёскі да вёскі, дзе пад'ехаў, дзе пешшу—дабраўся да свайго Сцяпка з надзеяй, што дома нага сама сябе залечыць. Ніякага падарунка матцы з бацькам не прынёс. А дома—як адыходзіў—галеча была, вярнуўся—і таго горай стала. Стары зусім аслаб. Адной бульбай перабіваліся. Бульба ў мундзірах, бульба напалам з хлебам, бульба—булён нішчымны, бульба—дранікі... Сын вярнуўся, а пачаставаць няма чым. Надрала старая Ліда бульбы ў начоўках, адціснула, крухмал адстояла і напякла бліноў.

— Пост, Макар. Гавеем,—пачаў апраўдвацца стары, белы ўвесь, згорблены.

Узрадаваўся Іван, што Макар вярнуўся. Вясной мужчыны панскую зямлю будуць дзяліць—і на Макара дадуць дзесяціну. Нат прыкідваць пачаў. «Калі Макара ажаніць—і на жонку дзесяціну дадуць. І двое работнікаў у сям'і будзе. От і жыць можна. Але ж—не! Ніхто цяпер са сваёй сям'і дзеўкі не аддасць, пакуль не палучаць на яе тую дзесяціну. І зямлю—чым яе абрабляць будзеш? Ні сахі, ні бараны. Усё жыццё парабкаваў з сынам на Ермалаевым полі. От калі б у Ермалая лішні плуг адабралі, ды яму, Івану, грамада аддала б! Тады б яно, канечне! А так... Давядзецца тую зямлю аддаваць у арэнду Ермалаю. І каня няма і хамута няма. Лічыцца будзе толькі, што зямлі дадуць». А ўсё-такі было б прыемна мець сваю зямельку. А можа Ермалай адшкадуе зерня на сяўбу, а можа каня хто-небудзь дасць? Глядзіш, і ўзаб'ецца Іван, хоць на старасці, на сваю гаспадарку.

Расстаралася Ліда пляшку гаралкі ў бабы Параскі — адсвяткавалі вяртанне сына. Хата старая ў Івана, топіцца, як даўней, пад дым. Палез Макар на палаткі, накрыўся посцілкай-раднянкай і задумаўся. А можа і вяртацца не трэба было б? Яно можна было б застацца пры атрадзе, але ж—нага. І от думай цяпер, з чаго пачынаць, як жыць.

Стары быццам адгадаў думкі сынавы:

— Людзі грошай на вайне ў жыдоў нахапалі, а ты нічога не прынес.

— Я ваяваў за ўладу новую, за нашу батрацкую. А тыя, што грошы ды транты прынеслі,—марадзёры. Грошы тыя цяпер нікому не патрэбны. Ленін, гаворыць, ужо робіць новыя грошы,—сказаў Макар.

— Грошай жа задарма не дасць і Ленін,—уздыхнуў стары, думаючы пра тое, што быў жа, пэўна, сын у такой справе, дзе можна было б хапануць што-небудзь: гадзіннік які, лыжкі сярэбраныя, падсвечнікі. Глядзіш, цяпер бы на хлеб памяняў.

— От вінен я Ермалаю тры пуды хлеба, от бы і расплаціўся,—пагараваў стары.

— А той хлеб, які я ў яго зарабіў перад мабілізацыяй, ён аддаў?

— Што ты зарабіў? Нічога ты ў яго не зарабіў! Нічога ён не аддаў.

— Як гэта не зарабіў? Вярну з працэнтамі,—паабяцаў Макар.

Ляжаў-ляжаў на палатках—нага заныла, палез на печ—пагрэць. Ляжыць, думае. «Канец зімы і на печы праляжу, а вясной пайду наймацца ў Дзесятуху. Не, туды не пойдзеш—там немцы. У Старадубе пэўна можна было б грузчыкам прыстроіцца, але ж таксама—немцы». Сам Макар нізкі, каржакаваты, круглая галава ў плечы ўрасла. Сілы, што ў добрага вала, а за што зачапіць сілу тую—няма.

Суткі вылежваўся салдат на гарачым чарэне. Рану грэў. На душы і спакойна быццам—дадому вярнуўся. Адваяваўся. А на другія суткі пачаў варочацца Макар і пра рану забыўся. Не ведае, куды ад успамінаў падзецца. Іх маршавая рота, сабраная з выпісаных са шпіталяў салдат, сфарміравалася ў Гомелі. Зноў паўтаралі ружэйныя прыёмы, спявалі ў страі, наступалі на лес. Рыхтаваліся да прарыву. Іх вывелі з Гомеля да Бела-Рэчыцы, каб бравых і адданых Часоваму ўраду салдат не зачапіла бальшавіцкая прапаганда, якая затлумляла галовы рабочых Гомеля. Кармілі добра. Да жанчын не пускалі—з хвіліны на хвіліну чакалі каманды вярнуцца на вакзал для пагрузкі. Па суседству быў панскі маёнтак. Неяк ад тутэйшых мужыкоў пачулі пра дзіўныя рэчы. Пана не было—збег. Маёнткам упраўлялі самі парабкі панскія. Жылі камунай. Хацелася салдатам адлучыцца ў тую камуну, распытаць людзей, пагаварыць, што гэта за штука, камуна, як у ёй жывецца і працуецца? Узялі панскую зямлю і не падзялілі, а разам робяць—чаму не падзялілі? Хіба арцеллю зручней? Не адпускалі афіцэры. Пасля неяк у маёнтку стральба ўсчалася. Роту па трывозе паднялі. Загад паслухалі. Вярнуўся пан, бунтаўшчыкі-парабкі не хочуць пусціць яго ў маёнтак. Недзе раздабылі зброю і занялі абарону. Атрымаць патроны! Не шкадаваць патронаў!

— Браткі салдацікі, ды гэта ж з нас карнікаў зрабілі!—закрычаў са строю Макар. Ён і крычаць не хацеў. Само закрычалася. Падумалася так. І закрычалі, захваляваліся салдаты.

— Не пойдзем!

— Братазабойства!

— Гатовіліся на германца, а пасылаюць сваіх забіваць!

— Хопіць, не жандары!

— Зноў паны зямлю назад адбіраюць!

— Здаць баявыя патроны!—загадаў ротны.

— Браткі, патронаў не здаваць — расстраляюць!

І не здалі патронаў. Выступіць на падаўленне камуны адмовіліся. А больш ні ў чым парадку не парушылі. Афіцэры пахаваліся параіцца. Без іх станавіліся ў строй. Без іх маршыравалі пад каманду каго-небудзь са строю, каб зачыншчыка не запрыкмецілі. Ішлі ў каравулы, бульбу на кухню абіраць. Вярнуліся афіцэры. Слухаліся іх, як быццам і не было нічога. На другі дзень роту адправілі на фронт. Ехалі з песнямі. Хацелі віну сваю загладзіць, выслужыцца. Маршам прыйшлі на пазіцыю. Спадзяваліся, што прарвуцца да немцаў у акопы. Размясцілася рота ў ляску, з паўвярсты ад перадавой. Адкуль ні вазьміся—агітатар ад палкавога салдацкага камітэта.

— Куды вас, бараноў, на убой гоняць? У немцаў жа рэвалюцыя скора будзе. Братацца з намі, а не ваяваць яны хочуць. Прапаную прыняць рэзалюцыю. Міністрам-капіталістам Часовага ўрада не давяраць! Патрабуем заключэння міру! Далоў вайну!

І замітынгавала штурмавая рота. Са штаба брыгады звоняць: замяніць салдат у акопах і падрыхтавацца да наступлення, а рота мітынгуе. Тады сам брыгадны генерал Ухтомскі прыскакаў на шэрым кані.

— Браткі-салдаты, каго вы паслухаліся? Бальшавікоў, якія з немцамі знюхаліся?

— Заткні сваё рыла!

— Я сам павяду вас у атаку.

— Забіваць заманілі!

— Браткі, за Расію...

— Самі Расею прадалі, а цяпер—за Расію...

Генерал падняў каня на дыбы, да ганка праўраўся, на якім стаялі афіцэры.

— Адправіць у тыл! Да смерці біць! Быдла! Хрыстапрадаўцы!

Афіцэры з ганка на роту пасунуліся. Генерал зноў паслаў каня на шэрую салдацкую масу. Рвануў з аднаго пагоны, з другога, з трэцяга.

— У трыбунал! У трыбунал!.. У трыбунал, скаціна!—крыкнуў у твар Макару і рвануў за пагон. І не стрымаўся Макар:

— Ах ты, рассабачы сын! Дакуль гэта мы ўсё скацінкай будзем!

І неяк само атрымалася, што прысеў Макар, парнуў вінтоўкай і прабіў генерала штыком і, быццам бярэмак сена, выхапіў яго з сядла і кінуў на афіцэраў. Тут жа ступіў два крокі назад і прыкрылі яго салдаты. Зашумелі, паднялі штыкі на афіцэраў, якія наганы павыхоплівалі.

— На штыкі іх!

— Гаспадзін ротны, лепш адыдзіце! — выдыхнула адным уздыхам рота.

Ротны крутнуўся да ганка, а адтуль у сенцы. Афіцэры—за ім. А рота стаіць узбуджаная, не разыходзіцца.

— Ты, Макар, генерала пырнуў?

— Браткі, не мог сцярпець. Не выдайце!

— Станавіся камандзірам. Будзем цябе слухацца.

— Не ўмею я, браткі, камандаваць. І не ведаю, што камандаваць.

— Выдадзім Макара—пашлюць нас далей грахі перад генералам замольваць. На нямецкія кулямёты пашлюць. Не выдаваць Макара!

— Хопіць! Наваяваліся!

— Толькі ўсім разам трымацца, каб не расфарміравалі. Калі рота—з намі нічога не зробяць.

Мітынгуе рота, раіцца. Ротны выйшаў зноў на ганак, за ім афіцэры роты.

— Ро-о-та-а!—закрычаў паручык. — Па загадзе начальніка штаба брыгады рота па аддзяленнях адводзіцца ў тыл на перафарміраванне!

— Не пойдзем па аддзяленнях! Ведаем!

— Панове! З генералам быў проста няшчасны выпадак... Усё ўзгоднена. І ніхто знаць нічога не будзе. Толькі вы самі языкі не развязвайце,—сказаў паручык. — Пастроіцца па аддзяленнях!

— Не выконваць каманды,—сказаў Макар ціха. І пайшло па радах:

— Камандзір загадаў не падпарадкоўвацца.

— Каманду не выконваць.

— Што ж вы тады збіраецеся рабіць, чорт вас вазьмі?!—закрычаў ротны.—Так і будзеце стаяць суткі? Ці двое? А пасля? Праз паўгадзіны начальнік штаба загадае павярнуць на вас артылерыю—мокрага месца ад вас не застанецца!

— Мы дэлегатаў пашлём на батарэю, гаспадзін ротны.

— Што ж вы прапануеце?

— Вязіце нас у Гомель!—крыкнуў Макар.

— А ў Гомелі што? Маці вас чакае ці што?

— Там бальшавікі, рабочыя. Яны не дадуць нас у крыўду.

— Вашы патрабаванні я далажу начальніку штаба брыгады. А пакуль—раз-а-айдзісь!

Выйшаў з натоўпу Макар.

— Перарэжце, браткі, салдаты, провад.—І паручыку:—Рота не разыдзецца. Хочаце, гаспадзін паручык, пойдзем з намі на Гомель—і хай там нашу віну народ рассудзіць. Па справядлівасці. Не пойдзеце з намі—здайце зброю.

Абязброілі афіцэраў. Пастроіліся. Чырвоную хустку недзе знайшлі. Прывязалі да арэхавай палкі, і панёс яе замест сцяга салдат побач з Макарам.

Ішла рота па франтавых тылах гадзіну, другую, трэцюю, вяртаючыся ў Гомель. Раптам на дарозе—афіцэр. Спыніў роту.

— Там кулямёты,—паказаў рукой у адзін бок.—Там—батарэя на шрапнельным прыцэле. Па загадзе камандзіра корпуса рота акружана. Будзеце бой прымаць ці складзеце зброю і заарыштуецеся?

Прыкінулі салдаты, агледзелі мясцовасць. Акружаны. За дзесяць мінут не будзе роты.

— Будзем заарыштоўвацца, гаспадзін прапаршчык,—сказаў Макар.

. . . . . .

Два месяца сядзела рота ў турме, чакаючы свайго лёсу. У турме і даведаліся, што ў Пет-

(Заканчэнне на 4-й стар.).

СКАЖЫ, ХТО ТВОЙ СЯБРА...

МЮНХЕН, РАДЫЁСТАНЦЫЯ «СВАБОДА», ДЫРЭКТАРУ

У падрыўной антысавецкай і антынамуністычнай прапагандзе не апошняе месца адводзіцца радыёстанцыі «Свабода», якая знаходзіцца на ўтрыманні Цэнтральнага разведвальнага ўпраўлення Злучаных Штатаў Амерыкі і вядзе свае перадачы з Мюнхена. Тут знайшлі сабе прыстанішча многія фашысцкія паслугачы і ваенныя злачынцы, якія сталі цяпер платнымі прапагандыстамі ЦРУ.

Гаспадары і шэфы радыёстанцыі імкнуцца з дапамогай сваіх наймітаў распаўсюджваць і падтрымліваць версію, нібыта яна існуе на сродкі дабрачынных амерыканскіх арганізацый і з'яўляецца голасам так званых «вызвольных сіл на выгнанні».

Натуральна, што робіцца ўсё, каб не афішываць прысланых ЦРУ асоб, якія займаюць тут усе кіруючыя пасады. Гэта наглядна выявілася і тады, калі ў газеце «Літаратура і мастацтва» было змешчана пісьмо галоўнага рэдактара радыёстанцыі «Савецкая Беларусь» Анатоля Стука, адрасаванае дырэктару радыёстанцыі «Свабода».

Адрасат пісьма не падаў голасу — з ланцуга была спушчана зграя наймітаў. Мы не трацім надзеі, што нам усё ж удасца пагаварыць з дырэктарам «Свабоды» напрамую, чым і выклікана гэтае новае пісьмо.

ПАН дырэктар! Як бачыце, і на гэты раз я не магу назваць вашага прозвішча і звярнуцца да вас згодна з усімі нормамі, якія выпрацаваны нашымі продкамі і якія ў наш цывілізаваны і адукаваны век лічацца элементарнымі ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі.

Мушу яшчэ раз зазначыць, што я разумею ўсю складанасць вашага становішча. Магчыма, што і вы адважыліся б падаць свой голас, калі б былі ўпэўнены, што ваша непаслухмянства і аступленне ад указанняў шэфаў установы, якая даверыла вам такую пасаду ў Мюнхене, застанецца незаўважанымі ў Вашынгтоне. Толькі гэтай акалічнасцю я магу вытлумачыць той факт, што вы вымушаны былі звярнуцца за дапамогай да сваіх апякуемых з так званай «беларускай філіі»

Бедалагі, яны так былі ашчаслівлены вашай увагай і так стараліся апраўдаць давер, што надзялілі вас тытулам «лідэра беларускіх эмігрантаў», атэставалі ледзь не «вялікім нацыянальным змагаром» на экзылі.

Лідэр, як сведчыць энцыклапедычны слоўнік, гэта чалавек, што накіроўвае волю, розум і дзейнасць прыхільнікаў і аднадумцаў на ажыццяўленне пэўных мэт і задум. Ну, што ж... У гэтым сэнсе вашы падначаленыя маюць усе падставы называць вас сваім лідэрам. Толькі не думайце, пан дырэктар, што вам першаму выпаў такі гонар. Роўна на дваццаць сем гадоў вас апярэдзіў намеснік Гітлера ў акупіраванай Беларусі — Вільгельм Кубэ. Пазнаёмцеся з газетамі тых часоў, і вы зможаце ацаніць красамоўства аднаго вашага падапечнага — Кастуся Рамановіча, а дакладней Рыгора Казака, які са скуры вылузваўся, імкнучыся давесці, што лепшага лідэра, правадыра, чым Вільгельм Кубэ, беларускаму народу і непатрэбна. Другі ваш саслужывец — Станіслаў Станкевіч сваю вернасць абвешчанаму лідэру стараўся даказаць не толькі словам, а і ўдзелам у арганізацыі масавых забойстваў беларусаў і вынішчэнні яўрэйскага насельніцтва ў горадзе Барысаве. У сувязі з гэтым я параіў бы вам, пан дырэктар, у гадзіны, вольныя ад вашых неспакойных спраў, іншы раз заглянуць у кнігу дакументаў пад назвай «Злачынствы нямецка-фашысцкіх акупантаў у Беларусі ў 1941—1944 гг.», якая выдадзена ў 1965 годзе. Тады вы змаглі б пераканацца, на што яшчэ здатны ваш «аўтарытэтны спецыяліст» па беларускай літаратуры.

Я думаю, што надта засмучацца ад такой навіны няма патрэбы, пан дырэктар. Ну, што зробіш, калі вам не дасталося першынство хадзіць у лідэрах у такой пярэстай кампаніі, затое вас паставілі ў адзін рад з такім паплечнікам Адольфа Гітлера, як Вільгельм Кубэ. У вашай установе, мяркуючы па той павазе, з якой там ставяцца да тых, хто прайшоў добрую школу ў гітлераўцаў, такое прызнанне і атэстацыя будуць мець немалаважнае значэнне для вашай далейшай службовай кар'еры.

Я гэта тавару яшчэ і для таго, каб вы ў сваю чаргу былі памяркоўнымі, калі, скажам, хто-небудзь з вашых падапечных, таксама кіруючыся матывамі сваёй службовай кар'еры, паспрабуе давесці, што ў яго жылах цячэ такая ж амерыканская кроў, як у вас. Праўда, я не ведаю, наколькі сур'ёзна гэта бярэцца пад увагу ў вашай установе, а вось у часы гітлераўскай акупацыі з цяжкасцю здабытая Рыгорам Казаком медыцынская даведка аб тым, што ў яго жылах ёсць прызнакі арыйскай крыві па мацярынскай лініі, адкрыла яму дзверы ў пярэднюю да вышэйшай гітлераўскай эліты.

Так, пан дырэктар, асяроддзе ў вас — лепшае не прыдумаеш. Я гэта вось да чаго. У гады вайны супраць гітлераўцаў нашы хлопцы з партызанскай брыгады — заслонаўскай (напэўна, чулі) — знайшлі ў забітага фашысцкага афіцэра нямецкай камендатуры неадпраўленае пісьмо жонцы. Дык вось гэты афіцэр пісаў, што ён заўсёды з агідай падае руку двум мясцовым здраднікам — бургамістру і начальніку паліцыі. Яму здавалася, што ён дакранаецца да нечага брыдкага. Ад такога пачуцця ён доўга потым не мог пазбавіцца, нягледзячы на тое, што старанна мыў і выціраў рукі. Паводле слоў фашысцкага афіцэра, ён з радасцю не падаваў бы рукі, але абставіны прымушаюць: без такіх людзей яму цяжка абысціся.

Я не ведаю, ці падаяце вы асабіста, пан дырэктар, руку, калі вітаецеся са сваімі памагатымі, якія дасталіся вам у спадчыну ад гітлераўцаў.

Магчыма, вы абмяжоўваецеся тым, што падаяце толькі долараву паперку, і вам потым не патрэбна старанна мыць і выціраць рукі. Вы, амерыканцы, я маю на ўвазе тых, хто купаецца ў грошах, верыце ў магічную сілу долара.

Мне, канечне, цяжка сказаць, на што здатны долар. Я магу толькі меркаваць па вайне, якую вядуць кіраўнікі вашай краіны ў В'етнаме. Я магу таксама меркаваць па паведамленнях сусветнага, у тым ліку і амерыканскага друку, які сыходзіцца на думцы, што забойцы прэзідэнта Джона Кенедзі, яго брата Роберта, негрыцянскага лідэра Марціна Лютэра Кінга былі шчодра асыпаны долярамі.

І ўсё ж такі, хоць таму-сяму з дапамогай долара іншы раз удаецца знішчыць некаторых непажаданых палітычных дзеячоў, я ўпэўнены, што не ўдалося пахаваць рашучасць амерыканскага народа змагацца за лепшае будучае сваёй краіны. У гэтым нас пераконвае цяперашні паход беднякоў на Вашынгтон, адмаўленне моладзі ехаць ваяваць у В'етнам, патрыятычная дзейнасць такіх выдатных сыноў Амерыкі, як доктар Спок.

Так, з дапамогай долараў вам удалося папоўніць рады сваіх платных прапагандыстаў, праўда, за лік фашысцкіх злачынцаў і некалькіх малакасосаў, што выраслі на задворках Мюнхена і якім не было дзе галаву прытуліць. Знаходка, ад якой вельмі патыхае. Ды і на што большае вы маглі разлічваць!

Няўжо вы, пан дырэктар, спадзяецеся на іх, як на сілу, што здольна прымусіць і нашых людзей па-іншаму, так, як вам хацелася б, думаць? Няўжо вы самі сур'ёзна верыце ў тое, што рознымі прыдуманымі праблемамі, скажам, як з кнігамі, азеляненнем і іншымі, вы зможаце пахіснуць веру нашага народа ў савецкі лад, у жыццё, якое ён будаваў, наладжваў, за якое праліваў кроў? Між іншым, фашысцкія заваёўнікі таксама на тое-сёе спадзяваліся, а потым прыйшлося горка расчаравацца. Дзіўлюся, як пра гэта вам не расказвалі вашы верныя збраяносцы Рыгор Казак і Станіслаў Станкевіч, якія, дарэчы, абяцалі гітлераўцам добразычлівасць і паслушэнства беларусаў.

Далібог, мне было вельмі смешна назіраць, як пасля майго звароту да вас вашы служкі, падабраныя на абломках гітлераўскага рэйха, выпіналіся адзін перад адным.

У мяне, пан дырэктар, складваецца такое ўражанне, што вам, амерыканцам, усё цяжэй і цяжэй становіцца рэкламаваць свой лад і спосаб жыцця. На самай справе, пасля нядаўніх злавесных падзей, якія ўзрушылі ўвесь свет, паспрабуй пераканай, што ў Амерыцы райскае жыццё, што гэта самая свабодная краіна. Тут патрэбны сапраўды адмысловыя прапагандысты.

Мяркуючы па тым, як укамплектаваны радыёстанцыя «Свабода» і іншыя інстытуты такога напрамку і характару, адзінымі добраахвотнікамі, якія з радасцю прапануюць свае паслугі, аказваюцца былыя гітлераўскія галаварэзы і іншыя індывідуумы, якім, як кажуць, губляць няма чаго, затое будзе кавалак хлеба, лішні долар на чорны дзень. Можаце сабе ўявіць, якую нянавісць, агіду і пагарду выклікае ў нашых людзей толькі адно ўпамінанне імёнаў тых, хто ў цяжкую хвіліну прадаўся ворагу, дапамагаў паліць і нішчыць нашых людзей, а цяпер з такой жа лёгкасцю ўзяў на сябе ролю прапагандыста спосабу жыцця, які насаджае нізкія пачуцці, калечыць чалавечую асобу.

Спадзяюся, пан дырэктар, што вы пазнаёміліся з апошняй заявай віцэ-прэзідэнта ЗША Хэмфры. На ўсялякі выпадак прывяду з яе невялікую цытату: «Злачынасць і насілле ў сённяшняй Амерыцы становіцца ўсё больш і больш звычайнай з'явай... У краіне ўчыняецца насілле над чалавечай годнасцю ў брудзе нашых трушчоб, адчай ахоплівае беспрацоўных, і непісьменнасць калечыць людзей».

Гэтыя словы належаць чалавеку, які пасля прэзідэнта займае самую высокую пасаду ў вашай дзяржаве.

Можна толькі вам паспачуваць, пан дырэктар, які цяжкі лёс выпаў на вашу долю — прапагандыста амерыканскага ладу жыцця.

А. СТУК,

галоўны рэдактар радыёстанцыі «Савецкая Беларусь».

ДОМА

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Стаяла ў Гомельскім парку сухое, нікому не патрэбнае дрэва. І раптам яно ажыло, загаварыла. Народныя ўмельцы — мастакі-дэкаратары А. Дабравольскі і А. Паплаўны выразалі з яго манументальна - дэкаратыўную скульптуру «Засмучаная маці». І хто б ні праходзіў каля яе — абавязкова спыніцца. Гора маці, яе пакуты кранаюць сэрцы людзкія...

Фота В. ДОННІКАВА.

ма раздаваць. І работы ў мяне для цябе таксама няма. Хацеў цябе пажалець, як ты кроў за цара праліваў... А ты, мусіць, сам таго цара скідаў... Няма ў мяне табе работы.

Макар падняўся. Сорамна стала перад Дуняй.

— І гэта я ў акопах тры гады вошай кармію, каб ты ўсё сяло — пад пазногаць?

— Як мы жывём, гэта наша дзела. Жывём і знаем, як жыць. Больш хлеба не пазычу. Пасядзіш галодным, палажыўшы зубы на паліцу, тады і прыходзь.

— Дзвюх жонак заездзіў — замардуй і трэцюю. Не прыйду я к табе больш, жываглот чортаў! — сказаў злосна Макар. — Да вайны што ў цябе хлеба зарабіў — па-добрам аддай! Не аддасі — за горла вазьму... Сілай дбяру! — Грукнуў дзвярыма.

Ермалай услед. Кінуўся да сабачай будкі, спусціў аўчарку:

— Валет, вазьмі!

Макар паспеў ухапіць перакладзіну дубовую, якой вароты запраліся, паспеў размахнуцца і апусціць яе на аўчарку.

— Людцы! Забіў — закрычала з ганка Ермалаіха. Макар кінуў перакладзіну пад свіран, пайшоў з двара. Ермалай дагнаў яго ўжо ля весніц. Ударам кулака збіў з ног.

. . . . . .

Тыдзень адлежваўся на печы Макар, зноў залечваў патрывожаную рану. Пасля з кійком пачаў выходзіць да мужчын — то да Міцькі, то да Амяльяна, то да яго прыходзілі былыя салдаты паслухаць, як ён генерала падняў на штык, як сядзела рота ў Гомельскай турме, як адступалі з Гомеля. І ўсе пачалі Міцьку падганяць — пара сход збіраць, пара панскую зямлю дзяліць па едаках.

— Падзелім. Па снезе дзяліць — межы перабліваем, — гаварыў Міцька.

Міжволі Макару думалася пачамі: «Трэба арганізаваць у сяле чырвоную гвардыю, як у Гомелі і ў Добрушы было... А Міцька... Ліха яго зразумее, Міцьку! Адно кодла з Ермалаем! Родныя браты!» Пачаў пытацца па сакрэту — хто згодзіцца ў чырвоную гвардыю? І кожнаму, хто згаджаўся запісацца, гаварыў, каб другім, каму пакуль — ні слова. Да Міцькі дайшло — прагаварыўся нехта. Міцька сказаў:

— Што ж гэта ты, змоўшчык? Мяне таксама запішы ў сваю гвардыю. Дзе небудзь унізе альбо першым, — жартуе, а вочы такія нахабныя і шэра-блакітныя, быццам у Ермалая, толькі што не зіркатыя. Вядома, роду аднаго — адным словам, Рудыя. Запісаў і Міцьку ў спіс. Раптам прыехаў пячонаўскі матрос да Міцькі. І яшчэ нейкія дзве падводы прыязджалі. А на другі дзень па рыхлым ужо снезе зноў прыехалі. У калёсах кулямёт станкавы. Аб чымсьці пагаварылі. Прыехалі да хаты Макаравай.

— Дачакаўся, будзе цяпер гвардыя, — сказаў Міцька Макару і загадаў ягонаму бацьку: — Давай, дзед, прайдзіся па сяле. Беднаце накажы, каб ішлі ў школу на сходку. У каго мужчын няма — хай бабы ідуць. Скажы — будзем пра зямлю гаварыць.

У цеснае школьнае памяшканне набілася баб, мужчын, старых. Багацеяў і тых, у каго конь быў, нікога не пусцілі. Двое на парозе стаялі — Міцька і Макар. Настаўнікам двух першых класаў працаваў Ягор, бабы Параскі сын, недавук з апошняга класа гімназіі.

— Табе нельга, Ягор, бо ты маеш сваяцкія адносіны з першым маім класавым ворагам і жываглотам Ермалаем, — папракнуў Макар тым, што Ермалай выдаў за настаўніка сваю маладзенькую трэцюю дачку.

— Я народны настаўнік, мне можна, — растлумачыў Ягор і спрабаваў прайсці. Але Макар пагардліва паглядзеў на яго сіняе гарадское паліто з каракулевым каўняром, на шапку каракулевую, сказаў з нянавісцю:

Нельга сюды панам. Не тая сходка.

Школу знутры замкнулі. Макар сеў за стол. Шапку зняў. Даўно нястрыжаныя валасы рукой прыгладзіў:

— Слова мае прадстаўнік Балтыйскага флоту, пасланец Старшыні Народных Камісараў таварыша Леніна матрос Кубай, — аб'явіў урачыста.

Мужыкі пазнімалі шапкі. Бабы пачалі хусткі папраўляць.

— Абстаноўка такая, — сказаў Кубай. — Тут от Шчорс праміж вас хадзіў, а вы і не ведалі.

— А госпадзі! — спалохаліся бабы.

— А мне... нам ён кулямёт пакінуў. От так. Такая абстаноўка. Па ўсёй Расіі ўлада Савецкая — у вас ніякай. А хто будзе панскую зямлю дзяліць? Можа Ермалаю альбо майму хрышчонаму Дзяміду даверыце? Яны вас вакол пальца абкруцяць і на пясок пасадзяць. Бальшавікі воласці прапануюць вам узяць уладу ў свае рукі. Трэба выбраць камбед.

— Што за камбед? — спытала адразу некалькі галасоў.

— Растлумач ім, Руды, што такое камбед, — сказаў паблажліва матрос, з ухмылачкай і такім тонам, быццам здзіўляецца: «Ну і людзі ў гэтым сяле! Дзівакі! Не разумеюць, што такое камбед!» Нікому і ў галаву не прыйшло, што сам Кубай толкам не разумеў, што гэта такое і навошта, калі ёсць сельскія і валасныя Саветы — ім і ўлада ўся. Але Міцька стаяў за камбеды. Хай будуць камбеды.

— Словам, гэта як рэўкомы. Рэвалюцыйныя камітэты, — сказаў Кубай, апярэдзіўшы Міцьку.

— Не, крыху не так, як гэта нам таварыш Кубай сказаў, — усміхнуўся Міцька. Пагладзіў, паскроб падбародак, хітра гледзячы ў столь. — Як бы гэта вам сказаць...

— Давай, Міцька, па простаму нам... як заўсёды, — падбадзёрылі яго.

— Камбед — гэта камітэт беднаты. От сельсавет таксама наша ўлада, народная. У сельсавет каго можна выбраць? Ды любога. Эсэр будзе — эсэра, меньшавік — меньшавіка. Скажам, мой брат вядро гарэлкі выставіць, а мала — дык і два, і ўжо каго скажа, таго і выберуць. Ён і будзе Ермалаеву руку трымаць. А вам нашто такая ўласць? Сельсавет — сельсаветам. А трэба яшчэ камітэт беднаты, як у Расіі, у людзей робяць. Тут ужо для Ермалая мы не выберам памочнікаў. А выберам сваіх, самых надзейных хлопцаў — трох. І які ім наказ дадзім, дык яны і рабіць тое будуць. І сельсавет кантраляваць, і багацеяў кантраляваць, і так рабіць, каб кожны бедны да восені на сваю гаспадарку, на свой хлеб узбіўся.

— А калі таго камбеда слухацца не будуць? — спытаў нехта.

— А вы нашто? А кулямёт нашто? Аднаго мала — два дастанем! — растлумачыў Міцька. — Каго вы ў той камбед прапануеце?

У камбед выбралі трох: Міцьку, Макара і Амяльяна. Прынялі першую рэзалюцыю: «Уся заканадаўчая ўлада ў сяле Сцяпок належыць камбеду, у распараджэнне якога паступае панская зямля па дуброву. Тая, што за дуброва — Пячонікам. Уся чарназёмная зямля будзе раздадзена толькі бедным і сіротам. Багацею Ермалаю зямлі не даваць. Астатнім — аддаць зямлю манастырскую. Дуброву ахоўваць. Спатрэбіцца. Манастырскі лес, як ён урэзаўся ў наша сцяпоўскае поле, падзяліць з пячонаўскай беднатой. Манастырскі лес можна сячы толькі з дазволу камбеда на самыя вострыя патрэбы, у каго хата старая, у каго хлява няма, хто сына будзе жаніць, каб у новую хату аддзяліцца. Панскі луг па левым беразе Вабліі — Сцяпку, манастырскі луг ад мелавой гары, што за дубровай, — адыходзіць пячонаўцам. Сенакосам бедната забяспечваецца ў першую чаргу. Камбед абавязвае засыпаць добраахвотна ў грамадскі фонд у магазею пяцьсот пудоў зерня на сяўбу. Ермалаю Рудому — сто пудоў, астатнім колькі каму ўстановіць зямельная камісія. Ермалай Руды засыпае свой хлеб бязвыплатна, як мірасед. Астатнім восенню камбед зерне верне».

Рэзалюцыю прынялі адзінагалосна. Міцька папрасіў, каб пра рэзалюцыю пакуль нікому ні слова, каб багацеі не пахавалі хлеб.

Кубай паехаў арганізоўваць камбед у Пячоніках. Усё аказалася так проста. Сабраць галоту, не пусціць багацеяў — і прымай рэзалюцыю. Падвечар забегалі бабы адна да адной: хто за рэшатам, хто за падсіткам. І ўсё сяло ўжо ведала напамяць прынятую беднатой рэзалюцыю.

Пераклад з рускай мовы.

ЗАВЯШЧАННЕ ЎРАЧА МУЗЕЮ

Збор старажытнай мэблі, фарфору, шкляных і сярэбраных вырабаў XVIII стагоддзя і пушкінскай эпохі завяшчала маскоўскаму музею А. С. Пушкіна Антаніна Сяргееўна Галавіна — урач-афтальмолаг, вучаніца акадэміка Філатава.

Дарунак Антаніны Галавіной, якая памерла ў 76-гадовым узросце, уключае больш як трыста рэчаў. Гэта славуты мейсенскі фарфор і лепшыя вырабы рускіх фарфоравых і шкляных гут, посуд і розныя мастацкія рэчы з серабра, кашалькі, вышытыя бісерам, жаночыя ўпрыгожанні. Сярод мэблі прыцягвае ўвагу столік-бюро з хвалістай бярозы ў стылі «ампір» цудоўнай работы. Дарунак Галавіной дазволіць узнавіць у экспазіцыі абстаноўку рускага дома пушкінскай пары.

Музей у чэрвені адкрыў спецыяльную выстаўку «Дарунак Галавіной». Яна прыцягнула вялікую колькасць наведвальнікаў.

Святлана АЎЧЫННІКАВА,

старшы навуковы супрацоўнік Маскоўскага дзяржаўнага музея А. С. Пушкіна.

(АДН).

АЎТАР — ПРЫРОДА

Недзе блізка паляўнічы.

Фота В. КРЭТАВА.

СТАРЭЙШЫ ПЕДАГОГ БРЭСТА

Калі яна скончыла кансерваторыю, Аляксандр Канстанцінавіч Глазуноў падараваў ёй сваю фотакартку з надпісам: «На добрую памяць высокаталенавітай піяністцы». Маладую выпускніцу панідалі пры кафедры, на гэтым настойвала любімы педагог Вольга Калантараўна Калантарава, але, як сённяшнюю моладзь вабіць рамантыка новабудоўляў, так моладзь дваццатых клікалі да сябе вялікія справы абвешчанай партыяй культурнай рэвалюцыі.

«Несці рабочым і сялянам святло мастацтва» — гэтыя словы сталі дэвізам для выхаванкі Ленінградскай кансерваторыі Жані Дабратворснай і яе сяброў, што раз'ехаліся па краіне.

Волагда, Вятка, Кастрама, Варонеж, Краснадар, Саратаў, Растоў-на-Доне... Дзе толькі не выступала маладая піяністка! У Сталінградзе пасля чарговага канцэрта ёй прапанавалі работу педагога. Цяпер, пасля пяці гадоў выступленняў на эстрадзе, Яўгенія Дабратворская лічыла сябе падрыхтаванай да такой місіі. Яна засталася ў горадзе і да пачатку Вялікай Айчыннай паспела выпусціць дзесяткі музыкантаў (вучнямі Я. Дабратворскай былі кампазітар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Аркадзь Мазаеў, салістка Маскоўскай філармоніі Ніна Вадап'янава і іншыя вядомыя выканаўцы).

У дні вайны Яўгенія Міхайлаўна ўступае ў франтавую брыгаду. Ідучы па слядах вайны, артыстка трапляе ў Брэст і тут застаецца педагогам у музычным вучылішчы.

Два дзесяцігоддзі — гэта амаль уся гісторыя музычнага жыцця Брэста, і ўся яна звязана з імем Яўгеніі Міхайлаўны.

Да Дабратворскай прыводзілі хлапчукоў і дзяўчынак, якія толькі спасцігалі мудрасць музыкі, у яе яны праходзілі школу і да яе вярталіся, калі пачыналі самастойнае жыццё на эстрадзе. Вучнямі Яўгеніі Міхайлаўны былі ўдзельнік Другога Міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага, выкладчык Растоўскага музычна-педагагічнага інстытута Анатоль Галалобаў, выкладчыца Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Агаф'я Шпакоўская, выкладчыца Горнаўскага музычнага вучылішча Людміла Уладзіміраўна і многія іншыя педагогі-піяністы.

Талент Яўгеніі Міхайлаўны аднолькава ярка праяўляецца і ў класе, і на эстрадзе.

На ўроках яна заўсёды спакойная, засяроджаная, і гэты «рабочы настрой» з першай мінуты перадаецца навучэнцу. Паназ педагога эмацыянальна-яркі, вучэбны рэпертуар яна свабодна іграе з любога месца. Як добрай маці, Яўгеніі Міхайлаўне заўсёды даражэй «цяжкія» дзеці. Яна ў два разы больш працуе з тымі, у каго адразу не праяўляецца талент, хто без настойлівай дапамогі педагога, магчыма, і зусім не «раскрыўся» б.

На эстрадзе Яўгенія Міхайлаўна ўся ў парывании. Для яе ігры характэрны слыбокі, санавіты гук, бліскучая тэхніка, выразная фразіроўка, разнастайнасць тушэ.

Нядаўна Яўгенія Міхайлаўна давяла канцэрт. Выконваліся творы Глазунова, Рахманінава, Ліста. Піяністка паланіла аўдыторыю напалам, самабытнасцю, свежасцю пачуццяў.

Мастацтва — гэта натхненне. Яўгеніі Міхайлаўне споўнілася семдзесят пяць, а яна па-ранейшаму энергічная, улюбёная ў сваю справу і сваіх выхаванцаў. Дзень пачынаецца з заняткаў за раялем і заняткамі за раялем заканчваецца — настаўніца не толькі вучыць другіх, яна і сама нястомна працуе над удасканаленнем свайго майстэрства.

Самы высокі век — не век, калі ты не вычарпаўся як майстар, калі работа па-ранейшаму ў асалоду табе. Калегі, таварышы, вучні сказалі гэта Яўгеніі Міхайлаўне ў дзень яе сямідзесяцігоддзя і пажадалі ёй, старэйшаму педагогу горада, і надалей быць такой на маладой і бадзёрай.

М. СОЛАПАЎ,

заслужаны дзеяч культуры БССР.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

5 ліпеня

Першая праграма. 10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — для школьнікаў. «Прыходзь, казка» (М). 10-30 — «На палях краіны» (М). 11-00 — Ф. Лоу. «Эліза Дуліт л». Прэм'ера тэлевізійнага музычнага спектакля. Перадача з Ленінграда. 12-20 — для малодшых школьнікаў. «Тэлезнайка» (М). 16-30 — «Навіны». 16-40 — праграма перадач. 16-45 — «Сяброўскія сустрэчы». 17-30 — «Беларускай каапераціі — 50 гадоў». 18-10 — XXII рэспубліканская спартакіяда школьнікаў. «Дзённік спартакіяды». Перадача з Брэста. 18-30 — «5+2». Штотыднёвы агляд. 19-00 — канцэрт, прысвечаны 50-годдзю Кампартыі Украіны. Перадача з Кіева. 22.00 — «Эстафета навін» (М).

Другая праграма. 17-05 — тэлевізійныя навіны (М). 17-15 — «Фізкультура і спорт». Тэлевізійны часопіс. Перадача з Тбілісі. 17-45 — «Творчасць маладых». Выступленне навучэнцаў сістэмы прафтэхадукацыі Узбекскай ССР. Перадача з Ташкента. 18-15 — насустрач IX Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Сафіі. Заключны тур вітарыны «За салідарнасць, мір і дружбу» (М). 19.00 — «Аголеная са скрыпкай». Тэлевізійны спектакль. 21-00 — «У магазіне цацак». Фільм-канцэрт.

6 ліпеня

Першая праграма. 8-55 — праграма перадач 9-00 — «Гімнастыка для ўсіх» (М). 9-45 — тэлевізійныя навіны (М). 10-00 — «З днём нараджэння!». Музычная вясёлая перадача (М). 10-30 — «Здароўе». Навукова-папулярная праграма (М). 11-00 — «Аб'екты». Тэлевізійны клуб кіна і фотааматараў. Перадача з Днепрапятроўска. 12-00 — «Навіны». Мастацкі фільм (М). 13-40 — для дзяцей. «Гіпноз». Навукова-пазнавальная перадача. 14-10 — тэлевізійны тэатр для дзяцей. Я. Шварц «Новыя прыгоды кота ў ботах». Лялечны спектакль. Перадача з Ленінграда. 15-15 — «Музычная шкатулка». 15-30 — праграма каляровага тэлебачання. «Саша-Сашачка». Мастацкі фільм. Клуб кінападарожніка? (М). 18-00 — у эфіры — «Маладосць» (М). 19-00 — «Сакрэтная каманда «Бумеранг». Прэм'ера тэлевізійнага мастацкага фільма ГДР. Чацвёртая серыя (М). 20-00 — канцэрт. Перадача з Сафіі. 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-00 — «Цырк пад адкрытым небам» (М). 22-00 — «Шарманка». Кароткаметражны фільм. 22-20 — «Я — з 60-х». Маладзёжная праграма. 23-10 — «Маленькі цуд». Тэлевізійны фільм. 23-25 — тэлевізійныя навіны (М). 23-35 — «Эстрада нашых сяброў (М).

Другая праграма. 13.40 — «Петразаводскае на адпачынку». Перадача з Петразаводска. 14-10 — для дзяцей. «Снежная королева». Мультыплікацыйны фільм. 15.15 — «Тыдзень блакітнага экрана» (М). 19.10 — В. Шакспір. «Макбет». Тэлевізійны спектакль. 21-15 — «Па старонках «Блакітных агеньчыкаў». Паўтор агеньчыка з Адэсы. 22-00 — «Белыя, белыя буслы». Мастацкі фільм (М).

7 ліпеня

Першая праграма. 8-55 — праграма перадач. 9-00 — «На зарадку станавіся!» (М). 9-15 — «Будзільнік» (М). 9.45 — тэлевізійныя навіны (М). 10-00 — «Альбом прыроды» (М). 10-30 — для юнацтва. «Лукамор'е». Літаратурны альманах (М). 11-30 — «Народны настаўнік» (М). 12-00 — «Творчасць маладых». Дзень Казахскай ССР на Усесаюзнай выстаўцы прафтэхадукацыі (М). 12-30 — «Навіны дня». Кінячасопіс (М). 13-00 — «Свяшчанныя месцы нашай Радзімы». Ноўгарад (М). 13-30 — «Для вас, жанчыны». Тэлевізійны часопіс (М). 14-00 — «Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М). 14-30 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. Канцэрт. Перадача з г. Куйбышава. 15-00 — «Музычны кіёск» (М). 15-30 — літаратурны тэатр Я Купалы. «Курган». У выкананні народнага артыста СССР Б. Платонава (у запісе). 16-00 — «Трэці семестр». Пра студэнцкія будаўнічыя атрады. 16-30 — праграма каляровага тэлебачання (М). 18-00 — «Сакрэтная каманда «Бумеранг». Прэм'ера тэлевізійнага мастацкага фільма ГДР. Пятая серыя (М). 19-00 — «Еўропа: падзеі, краіны, праблемы» (М). 19-45 — І. Штраус. «Лятучая мыш». Спектакль Кіеўскага дзяржаўнага тэатра аперэты (М). 23-05 — «Толькі факты». Праграма перадач. «Музычны малюк».

Другая праграма. 15-30 — у эфіры — «Маладосць». Перадача з Варонежа. 18-30 — «Хаціна дзядзькі Тома». Тэлевізійны спектакль. 20-45 — «Канцэрт песні і эстраднай музыкі». Кінафільм.

Беларускае тэатральнае таварыства глыбока смутнае з прычыны смерці заслужанага артыста БССР Бянеўскага Казіміра Іванавіча і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Калектыў Рэспубліканскага Дома народнай творчасці выказвае глыбокае спачуванне метадысту Рэспубліканскага Дома народнай творчасці Ксені Мікалаеўне Алінай з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці мужа, заслужанага артыста БССР Бянеўскага Казіміра Іванавіча.

Мінскі абласны Дом народнай творчасці выказвае глыбокае спачуванне метадысту Рэспубліканскага Дома народнай творчасці Ксені Мікалаеўне Алінай з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці мужа.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-52, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 01293